МОСКВА 19
УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИН.ТУТ
СОВ.СТРОИТ.И ПРАВА
1.12 38 2

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 71 (5745) | 27 сакавіка 1937 г., субота | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — Смялей разгортваць самакрытыку, яшчэ вышэй узняць пільнасць!

СМЕЛА І РАШУЧА РАЗГОРТВАЦЬ БОЛЬШЭВІЦКУЮ САМАКРЫТЫКУ!

СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧЫЯ СХОДЫ ПЯРВІЧНЫХ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ.

Р. Додзін, І. Турэцкі — Парочная сістэма кіраўніцтва профсаюзаў Беларусі.

Клімаў—Першы выпуск прапагандыстаў.

В. Харвацкі — Ачаг вайны ў даліне Дуная.

ЗА РУБЯЖОМ:

Паведамленне ЦК компартыі Францыі.

Заява тав. Майскага на пасяджэнні міжнароднага камітэта па неўмяшанню ў справы Іспаніі.

Падрабязнасці фашысцка-трацкісцкай змовы ў Валенсіі.

Правакацыйныя паводзіны інтэрвентаў.

СМЯЛЕЙ РАЗГОРТВАЦЬ САМАКРЫТЫКУ, ЯШЧЭ ВЫШЭЙ УЗНЯЦЬ ПІЛЬНАСЦЬ!

Учора «Звязда» апублікавала рэзалюцыю менскага гарадскога актыва КП(б)Б. Гэта рэзалюцыя ёсць рэзультат сур'ёзнай чатырохзённай работы большэвікоў менскай партарганізацыі.

У ходзе спрэчак комуністы, узброеныя рашэннямі Пленума ЦК ВКП(б), на сходзе менскага партактыва ўскрылі буйнейшыя недахопы і памылкі ў рабоце ЦК КП(б)Б, яго Бюро і Соўнаркома БССР і Менскага гаркома, узняўшы спяг самакрытыкі супроць самасупакоенасці, благадушша і паслаблення пільнасці.

«Некаторыя партыйныя кіраўнікі КП(б)Б забыліся, — гаворыцца ў рэзалюцыі, — што СССР знаходзіцца ў капіталістычным акружэнні, што буржуазія бесперапынна засылае і будзе засылаць да нас сваіх шпіёнаў і дыверсантаў, і прагледзелі той факт, што трацкізм ужо даўно перастаў быць палітычнай плынню ў рабочым руху і ператварыўся ў банду агалцелых забойцаў, дыверсантаў, шпіёнаў». Гэта прывяло да таго, што на чыгунках, размешчаных на тэрыторыі Беларусі, на водным транспарце, на цэлым радзе фабрык і заводаў Менска, Гомеля, Оршы, Віцебска і інш. гарадах рэспублікі працавалі трацкісты, падасланыя да нас япона-германскай фашысткай контрразведкай.

Дабрадушнасць, самасупакоенасць, паслабленне пільнасці, зусім недастатковае разгортванне крытыкі і самакрытыкі ў партарганізацыях, падхалімства і ўгодніцтва, якое глыбока ўмацавалася ў КП(б)Б, было той умовай, якая доўгі час давала магчымасць ворагу аставацца нявыкрытым, што з'яўляецца асабліва недапушчальным у КП(б)Б, працуючай на граніцы з капіталістычным захадам.

Усе гэтыя хваробы арганізацыі КП(б)Б трэба як мага хутчэй перамагчы. Сродак да гэтага — большэвіцкая самакрытыка. Большэвіцкая самакрытыка — праверэная зброя нашай партыі. Большэвіцкая самакрытыка ёсць зброя барацьбы з недахопамі ў нашай рабоце. Яна ёсць сродак, які павышае пільнасць комуністаў, дапамагае выкрыць ворагаў і мабілізаваць масы на барацьбу за перамогу комунізма. Узровень самакрытыкі, дасягнуты на сходзе менскага гарадскога партактыва, з'яўляецца толькі **пачаткам сур'ёзнага разгортвання самакрытыкі.** На справаздачна-выбарчых сходах, якія пачаліся ў КП(б)Б, спяг большэвіцкай самакрытыкі павінен быць узнят яшчэ вышэй.

На жаль, у некаторых партарганізацыях, як, напрыклад, на гомельскім партактыве, не дасягнут нават той узровень самакрытыкі, які быў на сходзе менскага партактыва. У Гомелі, ды і ў радзе пярвічных партарганізацый Менска (гл. «Звязду» за 26 сакавіка) крытыкуюць яшчэ з аглядкай, абыходзяць «вострыя куты». У аснове такой «крытыкі» ляжыць небольшэвіцкі падыход да кадраў. Іншыя думаюць, што кадры можна захаваць, вырашаючы пытанне па-сямейнаму, не чапаючы памыляючыхся, не папраўляючы іх. Гэта глыбока памылковыя, небольшэвіцкія адносіны да кадраў.

Таварыш Сталін вучыць нас, што кадры можна захаваць і выхаваць толькі на аснове большэвіцкай самакрытыкі, на аснове партыйнай крытыкі іх памылак і дапамогі работнікам. Таварыш Сталін не раз бічаваў тых, якія баяцца вынесіць «смецце з хаты», выпашаючых пытанні ў сямейным парадку. Ён гаварыў: «У нас нярэдка выпашаюцца пытанні .. так сказаць, у сямейным парадку, хатнім чынам. Іван Іванавіч, член кіруючай вярхушкі такой-та арганізацыі, дапусціў, скажам, грубейшую памылку і сапсаваў справу. Але Іван Фёдаравіч яго не хоча крытыкаваць, выяўляць яго памылкі, выпраўляць яго памылкі. Не хоча, так як не мае жалання «нажыць сабе ворагаў». Дапусцілі памылку, сапсавалі справу, — якая важнасць! А хто з нас не памыляецца? Сёння я яго, Івана Фёдаравіча, пашкалую. Заўтра ён мяне Івана Іванавіча, пашкалуе. Бо якая ёсць гарантыя, што я таксама не памыляюся? Чынна і добра. Мір і благаславенне. Запушчаная памылка ёсць псаванне нашай вялікай справы? Нічога. А вось як-небудзь выедзем на крывой. Вось, таварышы, звычайнае разважанне некаторых нашых адказных работнікаў. Але што гэта значыць?

Калі мы, большэвікі, якія крытыкуюць увесь свет, якія, гаворачы словамі Маркса, штурмуюць неба, калі мы ізеля спакою тых або іншых таварышоў адмовімся ад самакрытыкі, — то хіба не ясна, што нічога, апрача пагібелі нашай вялікай справы, не можа з гэтага атрымаппа?».

Разгортванню самакрытыкі ў КП(б)Б перашкаджае падхалімства і ўгодніцтва. Выхваленне кіруючых работнікаў, угодніцтва і падхалімства глыбока варожы большэвізму. Падхалімства і ўгодніцтва — сродкі, узятыя з арсенала класавага ворага. Актыў зусім справядліва раскрытыкаваў «Звязду», не толькі не стаўшую на чале барацьбы з падхалімствам, але сваёй перадавой ад 8 лютага культываваўшай падхалімства. «Актыў ухваляе рашэнне бюро ЦК ВКП(б) ад 19 сакавіка г. г. аб тым, — гаворыцца ў рэзалюцыі,—што перадавы артыкул «Звязды» ад 8 лютага 1937 года культывуе варожыя большэвізму і асуджаныя партыяй падхалімства і ўгодніцтва, якія, як правільна ўказвае «Правда», глыбока ўмацаваліся ў беларускай партыйнай арганізацыі». Падхалімства трэба рашуча выкарчаваць, а падхалімам даць на руках. Толькі пры гэтай умове ў КП(б)Б па-сапраўднаму разгорнецца большэвіцкая самакрытыка, не гледзячы на асобы.

Вораг арудаў і арудуе ў Беларусі і аставаўся доўгі час нявыкрытым яшчэ і таму, што некаторых гаспадарнікаў заела дзяляцтва, што некаторыя з іх бюракратычна сказілі прынцып алзінаначалля, ігнаруючы крытыку і параду мас. Яны забыліся, што сіла нашай партыі ў сувязі з масамі, што партыя не толькі вучыць масы, але і вучыцца ў мас. Таварыш Сталін неаднаразова паказваў прыклад таго, як трэба вучыцца ў мас, як беражліва і ўважліва трэба вывучаць вопыт мас. Вялікі Сталін вучыць нас, што цяпер лозунг авалодання тэхнікай павінен быць дапоўнен лозунгам авалодання большэвізмам. Гэта перш за ўсё азначае перамаганне дзяляцтва, уздым рэвалюцыйнай пільнасці, мабілізацыю актыва наркаматаў і ўсіх гаспадарнікаў на ліквідацыю вынікаў шкодніцтва.

Асаблівая ўвага партарганізацыі павінна быць прыцягнута да ідэалагічных участкаў работы (друк, Наркомасветы, прапаганда і т. д.). З прычыны «недаацэнкі з боку кіруючых партыйных органаў КП(б)Б значэння ідэалагічнага фронта і паслядоўнага ажыццяўлення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі партыі ва ўмовах КП(б)Б» у друк, у апарат прапаганды ў органы Наркомасветы і т. д. пралезлі ворагі. Яны шкодзілі і працягваюць яшчэ шкодзіць. І толькі палітычныя сляпыя не бачаць гэтага. Нельга ў сувязі з гэтым не адзначыць незразумелага роўнадушша комуністаў Наркомасветы, якія нават пасля менскага партактыва не зразумелі, што ім трэба сур'ёзна правераць кожны ўчастак сваёй работы, выкрыць прычыны ратазейства, дабрадушнасці і самасупакоенасці кіраўніцтва Наркомасветы БССР.

Члены КП(б)Б, узброеныя гістарычнымі рашэннямі Пленума ЦК ВКП(б), рыхтуюцца да справаздач і выбараў партарганаў, узнімаюць спяг самакрытыкі. Ужо зараз, у пачатку разгортвання крытыкі, высоўваюцца новыя людзі, якія раней, калі партком апіраўся на неяк-ую групу актыва, былі ў цені. Разгортванне самакрытыкі высуне вялікую групу новага партыйнага актыва. Трэба смялей выдвігаць новы партыйны актыў, асабліва з выраслых мясцовых кадраў, на кіруючую партыйную работу.

Абіраць у партыйныя органы людзей растучых палкам адданых партыі Леніна — Сталіна, пільных, карыстаючыхся давер'ем членаў партыі і народных мас — важнейшая задача выбараў парторганаў.

Смялей разгортваць самакрытыку, яшчэ вышэй узняць рэвалюцыйную пільнасць!

У МОЗЫРЫ НЕ КЛАПОЦЯЦЦА АБ СЯЎБЕ

Вясна застала мозырскіх кіраўнікоў зняцаку. Перадавыя калгасы раёна пачалі палявыя работы, а калі заглянуць ў зводку райземаддзела, то большасць лічбаў, характарызуючых падрыхтоўку калгасаў і адпаасобнікаў да сяўбы, сведчыць аб вялікім адставанні раёна.

Асабліва непрымімае становішча з вывазкай на поле гною і торфу. План па гною выкананы на 16,4 проц., а па торфу—на 2,5 проц. Калгасы некаторых сельсоветаў як напрыклад, Якімавіцкага, да вывазкі гною толькі прыступілі, а вывазку торфу нават яшчэ не пачыналі. План збору попелу таксама сарваны. Сабрана ўсяго 550 цэнтнераў, а трэба было сабраць 500 тон.

З засыпкай насенных фондаў становішча далёка не здавальняючае. За сярэдняй лічбай па раёну (105 проц.) засыпкі зернавых хаваецца ганебнае адставанне па раду сельсоветаў. Так, па Слабодскім сельсавеце зернавыя засыпаны толькі на 89 проц., па Антонаўскім—на 71 проц.

Зусім марудна праходзіць міжкалгасны абмен насення. Па абмену яравой пшаніцы план выканан толькі на 33 проц., па аўсу—на 37, па ячменю—19.

Так абстаіць справа з падрыхтоўкай да веснавой сяўбы ў паўднёвым раёне, дзе праз дзень-два трэба пачынаць ужо сеяць. Не трэба даказваць, што такое становішча ёсць прамы рэзультат самаўхілення райкома партыі і райвыканкома ад кіраўніцтва важнейшым участкам сельскай гаспадаркі. Высунуўшы з нізоў на пасаду загадчыка райземаддзела комуніста Кананчука, старшыня РВК і сакратар райкома не аказалі ім належнай дапамогі ў рабоце. Нават зараз, калі становішча з падрыхтоўкай да сяўбы яўна пагражаючае, райком і райвыканком асабліва не турбуюцца. Яны па-ранейшаму лічаць, што сяўба іх не датычыць і што гэта справа толькі райземаддзела.

Р. ФРАЛОЎ.

Совет Народных Камісараў Беларускай ССР з жалем паведамляе аб смерці народнага камісара лясной прамысловасці БССР тав. **РУДАКОВА Івана Грыгор'евіча.**

СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧЫЯ СХОДЫ ПЯРВІЧНЫХ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

ДЗЯЛЯЦКАЯ ПРАМОВА

Са спазненнем на 15 мінут адкрыўся сход партарганізацыі завода імя Варашылава. Абралі прэзідыум. Старшыня схода т. Тышко прадаставіў слова для справаздачы аб рабоце парткома яго сакратару т. Буевічу.

Гэты партком быў абран у студзені 1934 года, але за ўвесь перыяд ні адной яго справаздачы не было, не гледзячы на тое, што з часу выбараў змянілася 5 сакратароў парткома. Сакратары парткома, якія адклікаліся або здымаліся з работы, не лічылі патрэбным адчытацца перад партарганізацыяй.

За такі даволі працяжны перыяд накапілася многае, аб чым патрэбна было сказаць у справаздачы. Прайшлі праверку і абмен партыйных дакументаў, партарганізацыя абмяркоўвала пытанне аб уроках, якія выцякаюць з прадэса над контррэвалюцыйным трацкісцкім цэнтрам, нарэшце ўся партыя, у тым ліку і партарганізацыя завода імя Варашылава, мае такі гістарычны дакумент як рашэнні лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б).

На жаль, не гледзячы на тое, што даклад працягваўся дзве з паловай гадзіны, дакладчык аб гэтым ні словам не абмовіўся. Ён не сказаў і аб тым, што ў рамонтным цэху спадзішка арудуюць варожыя элементы, якія праводзяць шкодніцкую работу. Ён абавязан быў палітычна растлумачыць і той факт, што ў асобных цэхах кімсьці «невядомым» зрываецца нацэнгазета. Ён павінен быў палітычна падыйсці да растлумачэння пытання, чаму завод за люты месяц не выканаў вытворчую праграму. Але тав. Буевіч гаварыў аб усім і нічога не сказаў аб галоўным.

Між іншым з даклада высвятляецца зусім непрыглядная карціна з пастаноўкай палітычнай агітацыі на заводзе. Дакладчык не мог нічога сказаць аб тым, як праходзяць гутаркі сярод рабочых. Ён ні разу не прысутнічаў на гутарках агітатараў, не гаворачы ўжо аб тым, што ён сам ні разу не праводзіў гутаркі сярод рабочых.

Аб забыцці патрэб прапоўных гаворыць і такі факт. Завод мае невялікі інтэрнат, у якім жыве ўсяго 77 рабочых. Здавалася-б, што гэтаму інтэрнату трэба было ўдзяліць увагу, стварыўшы там неабходныя культурныя ўмовы. Гэтага не зроблена. У інтэрнаце выключная грязь; ніякай палітычнай работы не праводзіцца. З боку адміністрацыі завода праяўляюцца грубыя адносіны да рабочых.

Дакладчык не падвергнуў рэзкай крытыцы і буйнейшыя недахопы, якія ёсць ў пастаноўцы выхавання комуністаў. Нічога не сказаў ён і аб вырашчванні партыйнага актыва. Не выпадковым з'яўляецца і тое, што ён ні словам не абмовіўся аб рабоце са спачуваючымі.

З усяго гэтага відаць, што даклад не быў палітычна завостраным, мабілізуючым партыйную арганізацыю на разгортванне большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі.

Сёння пачынаюцца спрэчкі па справаздачы парткома. Трэба, каб партарганізацыя выправіла гэтую грубую памылку, запушчаную ў дакладзе парткома, і падвергла-б жорсткай крытыцы як недахопы ў рабоце парткома, так і стан кіраўніцтва гэтай партарганізацыі з боку райкома і гаркома партыі.

ОФЕНГЕЙМ.

Яшчэ не загаварылі поўным голасам

Ужо два дні праходзіць агульны сход партыйнай арганізацыі Вышэйшага педагагічнага інстытута. Справаздача часова выконваючага абавязкі сакратара парткома тав. Жарыкава і першы дзень спрэчак не выкрылі ўсе тыя агідзнасці, якія мелі месца ў рабоце партыйнай арганізацыі.

Той факт, што партыйны камітэт быў распушчан за супрацілеенне праверкі партыйных дакументаў, што ў працэсе праверкі і абмену ў гэтай арганізацыі было выключана амаль 50 процантаў яе складу, сярод якіх аказалася не мала прамых ворагаў народу, як Мельцэр, Гольдберг і інш., якія былі выкрыты не па ініцыятыве партыйнай арганізацыі ВШІ, павінен быў прымусіць комуністаў загаварыць поўным голасам.

Аднак і справаздача сакратара і выступленні асобных комуністаў (Адамушка, Блажэўскі і інш.) насілі агульны характар. Гэты агульны тон выступленняў з'яўляецца прамым рэзультатам таго, што ў арганізацыі адсутнічала крытыка і самакрытыка, нават меліся факты грубага заціску самакрытыкі. Аб пільнасці гаварылі не мала і на сходах і ў рэзалюцыях, але адсутнасць партыйнай работы стварала спрыяючую глебу для дзеянняў класавага ворага.

На працягу доўгага часу арганізацыя пярэла такое становішча, калі члены парткома Зарэцар, Ярмош і выведзены са складу парткома Філіповіч трапіравалі комуністаў. Яны пачкамі заносілі людзей у «пасіўныя», займаліся рвацтвам, груба заціскалі самакрытыку. Калі хто з комуністаў пасмеў сказаць слова, якое не спадабалася гэтай групе, яму пагражалі: «ты ў партыі трымаешся на валаску» і т. д.

Партыйны камітэт замест выхаваўчай работы займаўся тольки вынясненнем спагнанняў комуністам. У арганізацыі няма ні аднаго комуніста, які не атрымаў-бы партыйнага спагнання.

Аб антыпартыйнай дзейнасці парткома комуністы загаварылі толькі пры абмеркаванні пастаноў Пленума ЦК ВКП(б) і тут-жа агульны сход вывеў са складу парткома тт. Зарэцара і Ярмош, якія ўзначальвалі гэтыя антыпартыйныя справы.

Толькі з выступленняў асобных таварышоў (Рахман, Ліўшыц, Дземіхоўская) высветлілася, што партыйны камітэт зусім не кіраваў прапагандай і агітацыяй. У такім калектыве, дзе налічваецца больш 1.000 студэнтаў, агітацыйную работу праводзілі ў большасці комсамольцы. Сярод калектыва агітатараў толькі 4 комуністы. Партыйная арганізацыя па сутнасці самаўхілілася ад такога важнейшага участка работы, як палітычная агітацыя.

І не выпадкова, што ў інстытуце часта зусім адкрыта ўзнімаў галаву класавы вораг.

Тон размоў наогул не канкрэтна залаў у сваім дакладзе тав. Жарыкаў. Дастаткова прывесці пару вытрымак з яго даклада, каб не быць галаслоўным.

— Партком дастаткова займаўся агітацыяй, але не зрабіў таго, што трэба...

— Работу сярод беспартыйнага студэнцтва праводзілі не дрэнна...

А калі Жарыкаву кінулі рэпліку з просьбай расказаць аб фактах запіску самакрытыкі, Жарыкаў адказаў:

— Партыйны сход скажа аб фактах запіску самакрытыкі, яны ведаюць.

У спрэчках па дакладу выказалася 15 чалавек, але гэтыя выказванні не ўскрылі яшчэ ўсіх прычын прарываў, якія мелі месца ў рабоце партыйнай арганізацыі. Зусім мала гаварылі аб унутрыпартыйнай рабоце, аб авангардняй ролі комуністаў. І выступаўшыя ў спрэчках комуністы Філіповіч, Ярмош і Зарэцар, якія на працягу доўгага часу, карыстаючыся сваім становішчам, па сутнасці разлагалі, а не арганізоўвалі работу, не раскрытыкавалі паболшэвіцку свае памылкі.

Трэба меркаваць, што працяг спрэчак сёння выкрые ўсе недахопы партыйнай арганізацыі і канкрэтных вінаўнікаў гэтых недахопаў.

Ц. ФРЫД.

НА СХОДЗЕ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

25 сакавіка дакладам тав. Александровіча аб рабоце праўлення пачаўся сход совецкіх пісьменнікаў БССР. Работа Саюза совецкіх пісьменнікаў, як цэнтра арганізацыі творчай работы кожнага пісьменнікаў паасобку, далёка нездавальняючая. Яна павінна быць рашуча перабудавана. Шляхі гэтай перабудовы павінны падказаць гаспадары арганізацыі— яе члены і кандыдаты.

Аднак спрэчкі, якія ўчора пачаліся, паказваюць, што ў пісьменнікаў няма яшчэ глыбока-прынцыповай пастаноўкі пытання сваёй работы, выходзячы з тых урокаў, якія неабходна кожнаму зрабіць. Толькі прытуленнем класавай пільнасці тлумачыцца той факт, што ў саюзе доўгі час арудавалі ворагі народу Жылуновіч, Зарэцкі і іншыя — лютыя ворагі народу. Толькі бяздзейнасцю праўлення тлумачыцца і тое, што дрэнна працуюць секцыі, адсутнічае выхаванне маладых пісьменнікаў, няма сумеснай работы з тэатрамі і т. д.

За ўсе гэтыя глыбокія прарывы ў рабоце павінны несці адказнасць людзі, адказваючыя за пэўныя ўчасткі работы. Але няма ў выступленнях сапраўднай крытыкі і вельмі мала самакрытыкі. Учора выступаючыя таварышы налэўна палохаліся «каб чаго не вышла».

Вельмі аспярожна гаварыў Ільінскі пра кіраўніцтва драмсекцыі саюза, дзе да апошняга часу арудавалі ворагі народу. Бахвальствам, беспрынцыповасцю веяла ад яго прамовы.

Нават комуністы - пісьменнікі (Краснеўскі, Каповіч) не ўскрылі сутнасці спраў, якія дагэтуль былі ў арганізацыі. Краснеўскі ні слова не сказаў аб сабе як крытыку, а Каповіч «не вынес смецця з хаты», гаворачы пра работу яўрэйскай секцыі. А факт-жа, што ў яўрэйскай секцыі яшчэ не совецкая атмасфера ў адносінах паміж пісьменнікамі. Там малатых паэтаў запіскаюць за тое, што яны крытыкуюць Аксельрода, Аксельрод піша яшчэ не зусім добрыя вершы і пэдагуе варожыя кніжкі Рэйзіна. Няўжо ад гэта нельга яго моцна крытыкаваць.

Тав. Галавач, які выступіў наогул з крытычнай прамовай, усё-ж вельмі мала гаварыў аб сваіх памылках як рэдактара, не ўскрыў іх сутнасці, каб на гэтым павучыць астатніх.

Сёння на сходзе працяг спрэчак. Пісьменнікі павінны шырока разгарнуць крытыку і самакрытыку недахопаў сваёй работы, не зважаючы на асобы, поцыцынова, сур'ёзна, па-большэвіцку.

ЗАКРЫЎСЯ СХОД АКТЫВА ВІЦЕБСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

З 24 па 27 сакавіка адбыўся сход актыва віцебскай партыйнай арганізацыі. На актыве прысутнічала 1.000 чалавек. Усяго ў спрэчках запісалася 83 чалавекі і выступіла 38.

Тав. Жураўлёў (сакратар гаркома партыі), выступіўшы ў канцы спрэчак, згадзіўся з той крытыкай, якая дана была яму і гаркому на актыве. У сваім выступленні ён падрабязна спыніўся на дрэннай рабоце гаркома партыі і прывёў факты парушэння статута партыі і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, факты адарванасці гаркома партыі, ў першую чаргу сакратароў гаркома ад пярвічных партарганізацый.

Сход прыняў рэзалюцыю, у якой аднадушна ўхваляе рашэнні Пленума ЦК ВКП(б) і абавязуецца па баявому іх рэалізаваць.

У прынятай рэзалюцыі актыў горача ўхваляе рашэнне Пленума аб выключэнні з партыі подлых ворагаў народа, растаўратараў капіталізма Бухарына і Рыкава.

***

Падводзячы вынікі схода партыйнага актыва, трэба адзначыць, што крытыка і самакрытыка, хоць і праходзіла больш ажыўлена, чым на папярэдніх сходах актыва, але ўсё-ж была яшчэ далёка недастатковай. Толькі невялікая колькасць комуністаў выступала смела з крытыкай работы гаркома партыі і яго сакратароў. Асабліва адчувалася на сходзе актыва адсутнасць самакрытыкі з боку раду членаў бюро гаркома (Васількоўскі, Рагожкін, Эстрын і інш.) і слабая крытыка работы ЦК КП(б)Б і яго аддзелаў.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

(Падрабязную справаздачу аб сходзе актыва віцебскай партарганізацыі гл. на другой старонцы).

Папіраюць волю членаў партыі

24 сакавіка адбыўся сход партыйнай арганізацыі дубровенскай фабрыкі «Дняпроўская мануфактура», прысвечаны выбарам парткома. Сход рашыў абрать у партком 5 чалавек. Пасля гэтага рашэння сталі называць кандыдатуры. Названа было 10 чалавек. Адкрыліся спрэчкі па абмеркаванню кандыдатур. У вычіку спрэчак адна кандыдатура была адведзена. У спіс аказаліся ўключанымі 9 чалавек. Яны і галасаваліся закрытым (тайным) галасаваннем. Большасць галасоў сход аддаў т. Марголіну — прапагандысту фабрыкі, т. Цёмкіну — рэдактару шматтыражкі і т. Прудзікаву — дырэктару фабрыкі. А астатнія 6 кандыдатур былі забалаціраваны, як атрымаўшыя менш паловы галасоў удзельнікаў схода.

Здавалася-б, што склад парткома павінен і застацца з гэтых трох таварышоў, якім партыйная маса даверыла кіраўніцтва партыйнай арганізацыі. У пісьме ЦК ВКП(б) да ўсіх арганізацый ВКП(б) аб арганізацыі выбараў парторганаў сказана што «выбранымі ў склад партыйнага органа лічацца кандыдатуры, атрымаўшыя большасць галасоў, але не менш паловы галасоў прысутных на канферэнцыі дэлегатаў з правам рашаючага голаса». Аднак, не так рашыў сакратар райкома т. Мышалаў, які прысутнічаў на гэтым сходзе. Ён настаяў на тым каб члены партыі галасавалі зноў на той падставе, што перад тым, як назваць кандыдатуры, яны вырашылі выбрать партком у складзе 5 чалавек.

Сход зноў галасаваў. І ўжо ў гэты другі раз быў абран партком у складзе 5 чалавек. Комуністы прагаласавалі за тых, каму яны не хацелі-б даверыць кіраўніцтва партарганізацыяй. Ці правільна паступіў сакратар райкома? Вядома не. Ён навязаў партсходу рашэнне, якога ўдзельнікі схода не жадалі. Замест дэмакратычных выбараў у гэтай арганізацыі атрымалася папіранне правой комуністаў.

Райком павінен выправіць памылку свайго сакратара, які парушыў волю схода членаў партыі.

Г. ВЯРХОЎСКІ.

ВЫШЭЙ БОЛЬШЭВІЦКУЮ ПІЛЬНАСЦЬ

Другі дзень справаздачна-перавыбарчага схода партыйнай арганізацыі завода імя Кірава пачаўся з прызнання сакратаром парткома тав. Шамесам правільнасці крытыкі «Звяздой» яго справаздачы і ўзроўню спрэчак першага дня схода. Ён заклікаў членаў партыі выправіць гэта большэвіцкай крытыкай работы партарганізацыі.

Увогуле спрэчкі ўчора насілі больш крытычны характар, але рад комуністаў ўсё-ж стараліся крытыкаваць абязлічана, або ў лепшым выпадку крытыкаваць «стрэлачнікаў». Адчуваецца нейкая баязнь, палахлівасць — рэзультат панаваўшага ўвесь час у арганізацыі запіску самакрытыкі. Прыклад такой «крытыкі» падаў тав. Ноім, майстар цэха. Ён адважыўся сказаць, што ў партарганізацыі ёсць падхалімы. Але калі пачуліся рэплікі — хто канкрэтна падхалімы, ён, каб адзеляцца, адказаў: «Я потым успомню». Але так тав. Ноім і не «ўспомніў».

Падобная абязлічаная крытыка была і ў прамовах раду іншых таварышоў (Кісель, Шавель і інш.). Асобныя крытыкі не ўзнімаюцца вышэй цэхавага кіраўніцтва. Зусім рэдка ў прамовах чуваць прозвішча сакратара парткома.

Найбольш самакрытычным было выступленне рэдактара заводскай шматтыражкі «Кіравец» тав. Асаёнак. Яна расказала аб запіску самакрытыкі і сямейственасці, якія пранвіталі і культываваліся сакратаром парткома Шамесам.

Ні на адзін сігнал рабкораў у шматтыражны заводскія арганізацыі не рэагавалі. Але варта было пакрытыкаваць у газеце члена парткома Каповіча, або начальніка кавальскага цэха — былога загадчыка сталовай Тэтэльмана, які металам падхалімства заваяваў непахісны аўтарытэт і пастаянную падтрымку ў сакратара парткома Шамеса, як гэтыя пытанні неадкладна ставіліся на абмеркаванне парткома, для таго, каб іх змазаць. Гэта сямейственасць прывяла да прамога запіску самакрытыкі — аднаго разу т. Шамес проста прапанаваў рэдактару знять ужо з завяршанай паласы газеты фельетон аб тым-жа Тэтэльмане. Тав. Асаёнак расказала аб сямейственасці і падхалімстве ў самім партакоме. Калі па пасяджэнні партыйнага камітэта яна раскрытыкавала няправільную ўстаноўку дырэктара Сарокіна аб тым, што трэба на справаздачным сходзе гаварыць аб недахопах, прытрымліваючыся «пэўных рамак», член парткома т. Мацюк, каб змазаць памылку Сарокіна, выступіў у яго абарону, спрабуючы «пераканаць» прысутных, што Сарокіна не зразумелі, што ён хацеў сказаць зусім іншае. Такая ўзаемная абарона, узаемнае падхалімства ў членаў парткома—сістэма.

Кіраўніцтва шматтыражкай з боку парткома выразілася ўсяго толькі ў тым, што т. Шамес даў указанне рэдактару змясціць у газеце... партрэты членаў парткома Каповіча і Мацюка.

Тав. Асаёнак паказала на адсутнасць кіраўніцтва газетай і з боку Сталінскага райкома і гаркома партыі. Намеснік сакратара райкома т. Дзяткова выклікала раз рэдактараў заводскіх шматтыражак і прапанавала выпусціць спецыяльны нумар да пленума райкома. На гэтым усё кіраўніцтва райкома спынілася.

Выступіўшыя комуністы Уманскі, Піханаў і інш. гаварылі аб адарванасці парткома ад партыйных мас, аб адсутнасці выхаваўчай работы, аб тым што сакратар парткома Шамес і дырэктар завода Сарокін — рэдкія госці ў цэхах, зазналіся і з рабочымі не гутараць, што старшыня заўкома Лапідус таксама трэнна працуе і што старшыня горсовета Жуковіч ні разу не быў на заводзе і рабочаму папасці да яго вельмі цяжка.

На заводзе мелі месца факты яўна шкодніцкага характару. Нядаўна згарэў матор у механічным цэху. Выключна дрэнна памантуюцца варштаты. Некалькі разоў з насценнай газеты знікалі карыкатуры бракаробаў, разгільдзяеў, зрываючых работу цэха. Але ніхто не спрабаваў пашукаць канкрэтных вінаватых. Прытупленне пільнасці прывяло да таго, што на гэтыя факты не звярталі ўвагі. На партыйным сходзе і аб гэтым яшчэ разгорнута не гаворань, не мабілізавана пільнасць арганізацыі, каб раскрыць твар ворага і выявіць яго паўсямесна ізе ён шкодзіць.

Р. ДОДЗІН.

НА НАРАДЗЕ КУЛЬТПРОПАЎ

24 сакавіка адзел партыйнай прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б правёў нараду культпропаў і прапагандыстаў раёнаў па пытанню глыбокага вывучэння пастаноў Пленума ЦК ВКП(б) у сетцы паотыйнай асвяты.

На нарадзе прысутнічалі культпропы Аршанскага, Бабруйскага, Менскага і іншых райкомаў партыі, культпропы горайкомаў Менска і група прапагандыстаў з Гомельскага, Барысаўскага, Дзяржынскага, Смалявіцкага, Уздзенскага і інш. раёнаў.

Удзельнікі нарады выказалі думку аб неабходнасці вызнання зборніка асноўных матэрыялаў «Праўды», прысвечаных пытанням арганізацыйных прынцыпаў большэвізма і барацьбе партыі з растаўратарамі капіталізма — Бухарыным і Рыкавым.

Днямі адзел партпрапаганды ЦК КП(б)Б рассылае райкомам указальнік літаратуры і тэм для глыбокага вывучэння гістарычных пастаноў Пленума ЦК ВКП(б) з членамі і кандыдатамі партыі.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

СМЕЛА І РАШУЧА РАЗГОРТВАЦЬ БОЛЬШЭВІЦКУЮ САМАКРЫТЫКУ!

Сход актыва віцебскай арганізацыі КП(б)Б

Тры дні — з 24 па 27 сакавіка — цягнуўся сход актыва віцебскай партыйнай арганізацыі. З даклалам аб выніках Пленума ЦК ВКП(б) выступіў тав. Шуспін.

Тав. Шуспін дакладваў чатыры з лішнім гадзіны. Грунтоўна і падрабязна давёў ён да актыва рашэнні Пленума, падкрэсліваючы іх велізарнае палітычнае значэнне для ўсёй нашай партыі. Аднак, не гледзячы на прапягласць даклада, дакладчык не прывёў амаль ні аднаго прыкладу з віцебскай партыйнай арганізацыі, хоць вядома, што фактаў парушэння ўнутрыпартыйнай дэмакратыі і статута партыі ў віцебскай партарганізацыі многа. Ні слова не сказаў дакладчык і аб пастанове ЦК ВКП(б), у якой віцебскі гарком, сакратары яго абвінавачваюцца ў адрыве ад пярвічных партыйных арганізацый, які прывёў гарком да ралу буйных палітычных памылак.

Па дакладу разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Комуністы выступалі з рэзкай і смелай крытыкай недахопаў работы гаркома, яго апарата, сакратароў, а таксама недахопаў работы ў сваіх пярвічных партарганізацыях. Усе выступаўшыя таварышы падкрэслівалі выключна вялікае значэнне рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) для ўсёй нашай партыі, горача ўхвалялі выключэнне з партыі подлых растаўратараў капіталізма, здраднікаў рабочага класа Бухарына і Рыкава.

Першым у спрэчках выступае тав. Самсоненка (сакратар парткома фабрыкі імя Кагановіча). Тав. Самсоненка прыводзіць рад фактаў грубага парушэння ўнутрыпартыйнай дэмакратыі і статута партыі, меўшых месца ў партарганізацыі фабрыкі.

— Сакратары парткома і партыйныя арганізатары ў нас мяняліся часта, але ніхто з іх аб сваёй рабоце ніколі не адчитваўся. Былі таксама факты каптацыі. Партыйны камітэт яшчэ і на сёння дрэнна звязан з цэхавымі партарганізатарамі.

Далей тав. Самсоненка гаворыць аб наяўнасці запіску самакрытыкі ў партыйнай арганізацыі фабрыкі. Асабліва запіскаў крытыку былы дырэктар фабрыкі Марушкін. Ён праславіўся на фабрыцы ў пас, а раней на фабрыцы «КІМ» як заядлы гажымшчык крытыкі і самакрытыкі. Парткам гатым пытаннем займаўся, але бязэуба і нерэатучна. Марушкін у той час быў членам ЦК КП(б)Б. Я не раз па гэтаму пытанню бываў у сакратара гаркома тав. Жураўлёва. І што-ж? Замест таго, каб нам указаць, як трэба па-партыйнаму вырашыць пытанне аб запіску самакрытыкі з боку Марушкіна, тав. Жураўлёў мне сказаў: «Мы паставім аб ім пытанне ў ЦК». Тав. Жураўлёў, інакш кажучы, забараніў нам крытыкаваць Марушкіна ў сваёй партарганізацыі.

Тав. Самсоненка змяняе Васількоўскі (начальнік паліталдзела віцебскага чыгуначнага аддзялення). Тры месяцы, — гаворыць тав. Васількоўскі, — прайшло з таго часу як ЦК ВКП(б) указаў гаркому партыі на яго буйныя палітычныя памылкі. Аднак рашэнне ЦК ВКП(б) па сёнешні дзень не выканана. Гарком партыі сваю работу яшчэ не перабудаваў. Гутарак за гэты час было многа, а справы мала.

На нашым віцебскім чыгуначным вузле ўжо пасля абмену партдакументаў выключылі з партыі 5 контррэволюцыянераў-трацкістаў. Страціўшы рэволюцыйную пільнасць, мы не заўважылі гэтых ворагаў рабочага класа і выдалі ім партыйныя білеты. Аб страце пільнасці гаворыць таксама той факт, што на нашых вачах у паравозным дэпо і іншых участках доўгі час арудвалі дыверсанты, шкоднікі з лагера Троцкага.

Голас з месца: Гэта мы ведаем, а ты раскажы, як ты, як начальнік паліталдзела, забяспечваеш палітычную работу на вузле.

Не даючы адказу на рэпліку, абыходзячы закранутае пытанне аб рабоце паліталдзела і яго асабістай, тав. Васількоўскі прадаўжае прыводзіць прыклады парушэння партыйнай дэмакратыі ў пярвічных партарганізацыях. Аднак яго зноў перапыняюць.

— Раскажы, як па твайму ўказанню вывешваліся партрэты тав. Дзегцярова.

Тав. Васількоўскаму прыходзіцца прызнаць, што і з яго боку былі элементы падхалімства, у прыватнасці ў адносінах да начальніка паліталдзела дарогі тав. Дзегцярова. Партрэты Дзегцярова сапраўды страканілі на вузле. Аднак,—гаворыць тав. Васількоўскі, — гэтай хваробай хварэюць яшчэ і другія таварышы. Ён абвінавачвае рэдактара газеты «Віцебскі пролетарый» тав. Фрэйліна, які таксама на старонках газеты падаваў партрэты т. Жураўлёва. Аб рабоце паліталдзела, аб сваёй асабістай рабоце, як начальнік паліталдзела, тав. Васількоўскі так нічога і не сказаў.

Дарачы аб падхалімстве і важдзіме гаварыці і другія таварышы. Быў, напрыклад, прыведзен такі факт, калі ў бітрыне ФЗК трыкатажнікаў выстаўляліся партрэты Чарнякова і Галадзеда. Жураўлёва і Рагожкіна (сакратар гаркома комсамола). А на адной з дэманстрацый неслі партрэт... Школьнікава (дырэктар махорачнай фабрыкі).

Тав. Кавалёў (сакратар парткома «Сцяг індустрыялізацыі»), звярачае ўвагу партактыва на факты парушэння ўнутрыпартыйнай дэмакратыі ў партарганізацыі фабрыкі. Панаваўшая ў нас практыка каптацыі партыйнай арганізацыі, — гаворыць ён, — ушчымляла правы комуністаў. Сакратары парткомаў і партарганізатары, як правіла, ніколі не адчитваліся за сваю работу. Слабая пастаноўка партыйнай работы і палітычнай агітацыі, адсутнасць крытыкі і самакрытыкі аслабляла рэволюцыйную пільнасць. Партыйная арганізацыя не заўважала ворагаў, арудваўшых на фабрыцы.

— Як-жа гарком партыі мабілізоўваў нас на ўзмацненне рэволюцыйнай пільнасці? Усёй партарганізацыі вядома, што былому сакратару парткома фабрыкі, заядламу трацкісту Рохкінду дзверы гаркома былі заўсёды адкрыты. Тт. Жураўлёў і Башмачнікаў гэтаму контррэволюцыянеру занадта давяралі, а ён, выкарыстоўваючы давер'е сакратароў гаркома, праводзіў сваю контррэволюцыйную работу.

Далей тав. Кавалёў крытыкуе работу рэдакцыі газеты «Віцебскі пролетарый». «ВП» не паказвае на сваіх старонках работу гаркома, яго апарата. Апрача таго, газета няправільна арыентавала партыйную арганізацыю, заахвочваючы стварэнне на прадпрыемствах совета стаханаўцаў.

— Цяжка папасці на прыём да тав. Жураўлёва. — заяўляе сакратар парткома фанернага завода імя «Звязды» тав. Свярдлоў. За 10 месяцаў сваёй работы ў якасці сакратара парткома я ніяк не магу дабіцца прыёму ў тав. Жураўлёва. А пагаварыць ёсць аб чым. Гутарка па душах з сакратаром гаркома мне-б многае дала ў маёй рабоце. Апрача таго ў тав. Жураўлёва заўважаецца грубасць.

— Быў,—гаворыць тав. Свярдлоў,— такі выпадак. Інструктар гаркома партыі т. Пескіна спазнілася на пасяджэнне бюро гаркома. Яна растлумачыла што спазнілася на ўважлівай прычыне. У яе хварэла дзіця. Але тав. Жураўлёў тут-жа яе перапыніў:

— А якая мне справа да вашага дзіця!

Прыклад выключнай нячуласці да жывога чалавека.

Тав. Кіслік (сакратар парткома акулярнай фабрыкі) гаворыць аб парушэнні ў іх партарганізацыі 49 параграфа статута партыі. Не гледзячы на тое, што ў арганізацыі лічыцца менш 100 комуністаў, па гэты дзень у цэхах функцыянеруюць партыйныя групы. Работа інструктароў гаркома партыі, — прапягвае тав. Кіслік, — нас таксама не задавальняе. За 8 месяцаў мы ў сваёй партарганізацыі не бачылі ні інструктара, ні члена бюро гаркома. Праўда, прышоў да мяне цеяк раз тав. Красноў, назваўся нештатным інструктарам гаркома. Ну, думаю, цяпер ужо атрымаю, што называецца, жывы інструктаж. Але не тут-то было! Тав. Красноў пакапаўся ў пратаколах, і з тым і пайшоў.

Аб дрэннай яшчэ рабоце інструктароў гаркома гаворыць таксама сакратар парткома фабрыкі імя Клары Цэткін т. Астроўская. Замест таго, каб дапамагчы мне выпрацаваць план работы, прымяняючы да ўмоў сваёй партарганізацыі, інструктар гаркома тав. Матвеєў паказаў мне план работы партарганізацыі фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» і парэкамендаваў проста перапісаць яго. Зразумела я з такім трафарэтным падыходам да справы не згадзілася.

— Мы не адчуваем, — сказаў выступаўшы сакратар парткома завода імя Кірава тав. Пальман,—перабудовы работы гарадскога камітэта партыі. Тыя-ж шматлікія пытанні на пасяджэннях бюро гаркома, тыя-ж галзіныя чаканні прыёму ў сакратара гаркома. У самім гаркоме працвітае сямейственасць. Па-сямейнаму бюро гаркома вырашыла пытанне аб марынаванні шматлікіх скаргаў прапоўных з боку гарадскога совета (старшыня горсовета Сухаручкін). Замест таго, каб палянць гэта пытанне на належную палітычную вышыню, прыцягнуць да адказнасці вінаўных у марынаванні скаргаў прапоўных, бюро гаркома пастанавіла... прапанаваць тт. Сухаручкіну і Фрэйліну выпрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы... Бюро гаркома не выконвае сваёй-жа пастановы аб тым, каб члены бюро і інструктары 75 проц. свайго рабочага часу знаходзіліся ў пярвічных партарганізацыях. ЦК КП(б)Б таксама не выконвае свайго рашэння аб узмацненні кадрамі гаркома, у прыватнасці інструктарскім персаналам. Тав. Рубінштэйн, з ЦК, прыехаўшы аднаго разу да нас, абяцаў многае, але не выканаў нічога.

Тав. Эстрын (нам. старшыні горсовета) гаворыць аб неабходнасці перабудовы работы горсовета. У горсавеце, — гаворыць ён, — многа парадной шумікі, а канкрэтных спраў мала. Многа дэпутатаў горсовета бяздзейнічае. Член прэзідыума горсовета тав. Есько ніколі не бывае на пасяджэннях прэзідыума горсовета. Члены горсовета і секцый Рагожкін (сакратар гаркома комсамола), Шумкоў (дырэктар іголкавага завода), Грынберг (дырэктар шчоткамбіната) і інш. — гэта ўсё «ганаровыя людзі», трамвайныя дэпутаты.

Актыў чакаў ад тав. Эстрына большэвіцкай крытыкі работы прэзідыума горсовета, кіраўнікоў горсовета — яго і старшыні тав. Сухаручкіна. Фактаў у тав. Эстрына было хопь адбаўлай. У іх-жа на вачах у горсовеце арудвалі заядлыя ворагі рабочага класа контррэволюцыянеры, трацкісты Казлунова, Хоміч, Бацяноўскі і інш. Горсовет груба парушаў фінансавую дысцыпліну. У горсовеце налажваліся п'янкі і т. д., і т. д. Але тав. Эстрын аб усім гэтым ні слова не сказаў. Ён таксама абышоў маўчаннем той факт, што гарком партыі ліберальна адносіўся да б. старшыні горсовета самадура Аверына, які насаджаў у горсовеце бюракратызм.

Адсутнічала самакрытыка таксама ў сакратара гаркома комсамола тав. Рагожкіна. Ён гаварыў аб многім. Аб дрэнным выкладанні Канстытуцыі ў школах, аб дрэннай рабоце гарана і культпропа гаркома партыі, адарванасці ад школьнага жыцця і т. д., і т. д., але нічога абсалютна не сказаў аб дрэннай рабоце самога гаркома комсамола, яго адарванасці ад пярвічных комсамольскіх арганізацый, важдзіме і падхалімстве, якія яшчэ маюць месца ў самім гаркоме комсамола. Тав. Рагожкін таксама не палічыў патрэбным выступіць па поваду кіраўніцтва комсамолам з боку гаркома партыі. Хоць вядома, што гэта кіраўніцтва яшчэ вельмі і вельмі недастатковае.

Наша панчошна-трыкатажная фабрыка імя КІМ, — выступае дырэктар фабрыкі т. Ханіна, — самае буйнае прадпрыемства ў Беларусі. Фабрыка налічвае 8.000 рабочых. Здаецца, гарком партыі і горсовет нашай фабрыцы павінны былі аддаць вялікую ўвагу. На справе гэтага няма. Ні тав. Жураўлёў, ні тав. Сухаручкін у нас не бываюць. Мы іх не бачым у сваёй партарганізацыі. Мяне асабіста выклікаюць у гарком толькі ў тым выпадку, калі патрэбна «накачаць».

Далей тав. Ханіна гаворыць аб вялікіх цяжкасцях, якія перажывае фабрыка ў даны момант. З-за адсутнасці сыравіны фабрыка фактычна не працуе. За апошні квартал фабрыка недадала дзяржаве каля 3 мільёнаў пар панчох. Аднак, на гэта пяжкае становішча фабрыкі ніхто не звярачае ўвагі. Ні наркамат, ні прамысловы аддзел ЦК КП(б)Б. Тав. Готфрыд абяцаў прыняць тэрміновыя меры, але сваё абяцанне так і не выканаў.

Аб тым, што члены бюро гаркома — рэдкія госці на прадпрыемствах, гаворыць таксама дырэктар завода імя Кірава тав. Слісберг.

— На нашым заводзе на працягу трох год тав. Жураўлёў быў усяго толькі адзін раз.

Тав. Есько (заг. культпропам гаркома) гаворыць аб яшчэ нізкім стане партыйнай асветы. Асабліва дрэнна абстаіць справа з вучобай партыйнага актыва. З-за розных пасяджэнняў і пленумаў заняткі партактыва часта зрываюцца. У такім становішчы, — гаворыць тав. Есько, — вінаўны галоўным чынам гарком партыі і асабіста я, як загадчык культпропа гаркома. Сваё далейшае выступленне т. Есько прысвячае недастатковаму кіраўніцтву культпропа ЦК КП(б)Б. На працягу 1936 года культпропы ЦК правёў толькі 2 нарады культдзелаў райкомаў і гаркомаў. Выключна дрэнна працуе Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б. Гісторыю КП(б)Б інстытут ужо звыш 6 год ніяк не можа напісаць.

Тав. Швец (заг. домам партактыва), гаворачы аб яшчэ нездавальняючай рабоце дома партактыва, звярачае ўвагу схода на той факт, што ў нядаўна выпушчаным падручніку «Эканамічная геаграфія БССР» зусім адсутнічае роля Сталіна ў ВКП(б) і рускага пролетарыята ў ўтварэнні перамогі сацыялістычнай рэволюцыі ў Беларусі.

Тав. Сазон Сазонтаў, а таксама тав. Усачанка (ваенная часць) крытыкуюць гарком і сакратароў гаркома за зусім слабую сувязь гаркома з ваеннымі партарганізацыямі.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

Крытыка з аглядкай

Другі дзень работы схода партактыва гомельскай партарганізацыі прайшоў на такім-жа ніжім узроўні, як і ў першы дзень. На другім пасяджэнні схода ў спрэчках па дакладу тав. Галадзеда выступіла вельмі шмат прамоўцаў, але ні адзін з іх не разгарнуў сапраўднай крытыкі і самакрытыкі так, як таго патрабуе лютаўскі Пленум ЦК ВКП(б). Выключэнне можа быць зроблена толькі да 3—4 чалавек, якія больш-менш правільна зразумелі сваю задачу і адкрыта выступілі з крытыкай работы партыйных і совецкіх органаў.

Тав. Капман (завод «Гомсельмаш») зусім правільна рэзка крытыкаваў работу Соўнаркома БССР, у прыватнасці яго старшыню тав. Галадзеда за лепельскія справы і за дапушчэнне аналагічных з'явішчаў у радзе іншых раёнаў. Тав. Міхлін (завод імя Кірава) крытыкаваў гарком КП(б)Б за адсутнасць кіраўніцтва заводскім друкам і прапагандыстамі.

Аднак ні Міхлін, ні Капман у сваёй крытыцы не пайшлі далей крытыкі аддзелаў гаркома. У іх не хапіла мужнасці пакрытыкаваць сакратароў гаркома тав. Стакуна і Драбінскага. На сходзе былі і яўна падхалімскія выступленні. Вось на трыбуне дырэктар банка т. Блюдзін. Ён, кінуўшы баязлівы позірк у бок прэзідыума схода, пачаў сваю прамову наступнымі словамі:

— Я дазволю сабе крытыкаваць работу гаркома партыі... (позірк у бок прэзідыума). — Гарком апошнята склікання больш другіх прымяняў большэвіцкія метады ў сваёй рабоце. І тут-жа Блюдзін пераскочыў на менш небяспечную тэму, расказаўшы, што старшыні сельсоветаў не займаюцца паліт'работай.

«Крытыкуючы» гарком партыі, Блюдзін за кожным разам гаварыў:

— Мне здаецца, а можа я не ведаю, або памыляюся.

З траскучымі прамовамі выступілі тт. Граналштэйн, Розіна, Герман. Ім нават удалося сабраць шумныя апладысменты. Аднак ні адзін з памянёных у сваёй крытыцы нават не назваў сакратара гаркома, кінуўшы ўсю сваю ярасць крытыкі на інструктароў гаркома. Прычым кожны з іх чамусьці забываў расказаць аб сваёй уласнай рабоце.

З пракурорскай прамовай выступіў выконваючы абавязкі сакратара гаркома т. Гліксон, які на аснове пераглядзу пратаколаў пярвічных партарганізацый абвінаваціў гэтыя арганізацыі ва ўсіх грахах.

Ход работы схода паказвае, што крытыка тут па-сапраўднаму не разгорнута, што яна не ўзнялася вышэй крытыкі інструктароў гаркома партыі.

ЧЫКУН.

НА СХОДЗЕ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ФАБРЫКІ „КОМУНАРКА"

25 сакавіка партком фабрыкі «Комунарка» рабіў справаздачу перад партыйнай арганізацыяй за тры з паловай гады сваёй дзейнасці. Дакладчык сакратар парткома т. Рабкін расказаў сходу аб парушэнні статута партыі, прыпынпаў унутрыпартыйнай дэмакратыі, парушэнні пастаноў партыі аб індывідуальным прыёме, аб слабай падрыхтоўцы партыйных сходаў, недастатковым разгортванні палітычнай і агітацыйнай работы сярод рабочых, недастатковым кіраўніцтве стаханаўскім рухам і комсамольскай арганізацыяй фабрыкі.

Аднак, самакрытыка не была ўзнята на належную вышыню. Дакладчык імкнуўся ахапіць літаральна ўсе пытанні партыйнага і гаспадарчага будаўніцтва і запягнуў справаздачу на дзве гадзіны. Партыйны сход вымушан быў даць тры разы дакладчыку па некалькі мінут для акруглення. І ўсё-ж т. Рабкін не здолеў у дастатковай меры выявіць прычыны пералічаных ім недахопаў у рабоце партыйнай арганізацыі. Ён даволі часта прыводзіў агульныя факты. Так, тав. Рабкін расказвае аб шкодніцтве на фабрыцы, аб частых аварыях, выпуску недобраякаснай прадукцыі. Ён гаворыць, што там-жа працуюць комуністы. Аднак, назваць прозвішчы іх так і не адважваецца. Ён абышоў і нічога не сказаў партыйнаму сходу аб кіраўніцтве з боку гаркома і райкома партыі.

Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі.

— Сакратар парткома, — гаворыць т. Каган, — недастаткова самакрытычна расказаў аб рабоце асобных членаў парткома. — А вось член парткома Купершток адарваўся ад рабочых мас. На пасяджэннях парткома не адчувалася актыўнасці членаў партыйнага камітэта. Яны былі наглядальнікамі і бездапаможна галасавалі за чарговыя пастановы. Гарком і райком не аператыўна кіравалі работай партыйнай арганізацыі нашай фабрыкі. Так, аднаго разу да нас прыехаў т. Рыскін. Ён прайшоў па цэхах і нават не пагаварыў з рабочымі або з раднымі комуністамі. Хіба гэта канкрэтная дапамога ў рабоце партыйнай арганізацыі? Безумоўна, не.

У сваім дакладзе тав. Рабкін ні адным словам не абмовіўся аб сабе, як сакратару парткома. Вось у нас зараз на фабрыцы прарывы. У чым справа? Хто ў гэтым вінаўны? Мы не ўваходзім у дэталі, а досыць часта разважаем наогул. Мы не гаворым аб дырэктару фабрыкі т. Любіне, старшым інжынеру Пузанаве і інш. гаспадарніках, якія павінны непасрэдна адказваць за тыя непаладкі, якія ёсць у рабоце нашай фабрыкі, — гаворыць Мерзон.

— Члены парткома выключна дрэнна працавалі. Вось т. Яглоўскі дапусціў да таго, што на цэхавым партыйным сходзе быў абран старшынёй беспартыйны. А Купершток? Ён досыць часта замяшчаў сакратара парткома. І ў гэты час заўсёды партком быў на замку. Члены парткома аказаліся ніжэй радавых комуністаў, яны не сталі прыкладам у выкананні ўказанняў нашай партыі па павышэнню свайго тэаратычнага ўзроўню, — гаворыць тав. Пагарэйчык.

— У нашай партыйнай арганізацыі,— кажа тав. Гурэвіч, — ёсць факты падхалімства і ўгодніцтва. Так, напрыклад, Мінькоў займаецца раскраданнем сацыялістычнай маёмасці ў шакаладным цэху. І не гледзячы на тое, што аб гэтым некалькі разоў сігналізавалі дырэктару фабрыкі тав. Любіну, ён чамусьці яго пакрывае. І гэта невыпадкова, бо Мінькоў з яўляецца актыўным падхалімам у т. Любіна. Або кандыдат партыі Турэнкі. Ён нізае не працуе і атрымлівае зарплату. Дырэктар пасылае яго ў камандыроўкі і раз'езды. Там ён, выконваючы «даручэнні», вядзе закупкі розных неабходных гаспадарчых рэчаў для дырэктара Любіна і яго жонкі, а таксама нарыхтоўвае прыпожыя статуэткі для ўбрання дырэктарскага кабінета.

У першы дзень схода ў спрэчках запісалася 38 асоб. Выказаліся 6 таварышоў. Комуністы партыйнай арганізацыі абавязаны, узброіўшыся рашэннямі Пленума ЦК ВКП(б), узняць большэвіцкую крытыку і самакрытыку на большую вышыню.

М. АСТАПЕНКА.

Ачаг вайны ў даліне Дуная

Пачатак 1937 года адзначыўся значным ростам актыўнасці германскага фашызма ў Аўстрыі. Узмацніла сваю дзейнасць аўстрыйская агентура германскага фашызма. У канцы студзеня была заключана германа-аўстрыйская гандлёвая згода, якая мае надзвычайна важнае значэнне.

Усё гэта надае новую актуальнасць аўстрыйскай праблеме, якая з'яўляецца на працягу апошніх год адной з сур'ёзнейшых праблем міжнароднай палітыкі.

Як вядома, Аўстрыя ў планах германскага фашызма адыгрывае вельмі значную ролю. Германскі фашызм разглядае Аўстрыю, як сваю вотчыну. Нямецкім школьнікам прапануюцца атласы, у якіх Аўстрыя ўключана ў склад «Трэцяй імперыі». Упярджэнне германскага панавання ў Аўстрыі, на мыслі фашысцкага кіраўніцтва, павінна наблізіць Германію да асноўных палітычных і эканамічных цэнтраў паўднёва-ўсходняй Еўропы умацуе пазіцыі Германіі ў адносінах да Італіі, дапаможа Германіі распаўсюдзіць сваё панаванне на ўсю даліну Дуная.

Падрыўная работа фашысцкай Германіі ў Аўстрыі ажыццяўляецца пры дапамозе аўстрыйскіх нацыянал - сацыялістаў, якімі кіруе знешнепалітычны аддзел германскай фашысцкай партыі і заграніччная арганізацыя той-жа партыі. Далей германскі фашызм выкарыстоўвае арганізацыі «Саюза нямпаў за граніцай», а таксама аўстрыйскі легіён. Поплеч з усімі гэтымі арганізацыямі працуе Гестапе і ваенная разведка.

Фашысцкія арганізацыі ў Вене замаскаваны і хаваюцца пад шырмай розна-стайных цэнтральных таварыстваў. У якасці такой шырмы служылі, напрыклад, «Таварыства культурнага збліжэння ва ўсходняй і паўднёвай Еўропе» і «Цэнтральнае еўрапейскае бюро прасы», кіруемыя Гербертам Шнейдэрам (кіраўнік нелегальнай венскай фашысцкай арганізацыі). Грашовыя сродкі нелегальныя нацыянал-сацыялістскія арганізацыі атрымліваюць з Берліна.

Аўстрыйскі легіён налічвае, прыкладна, 50 тыс. чалавек. Германскі фашызм забяспечыў яго зброяй, у тым ліку авіяцыяй, артылерыяй і т. д. Базай аўстрыйскага легіёна з'яўляюцца вобласці Баварыі, якія мяжуюцца з Аўстрыяй. Атрады легіёна дзейнічаюць нелегальна ў Аўстрыі разам з падпольнымі арганізацыямі штурмавікоў.

Германскі фашызм у свой час паспрабаваў выкарыстаць усе ўказаныя арганізацыі для лабавой атакі супроць Аўстрыі. Была арганізавана палая серыя тэрарыстычных актаў; пры дапамозе баварскай радыёпрэсы, лятучак, раскідваемых з самалётаў і т. д., вялася шалёная агітацыя супроць аўстрыйскага ўрада. Аўстрыйскі легіён быў падрыхтаваны для ўзбраення ў Аўстрыю. Германія правяла рад эканамічных рэпрасій супроць Аўстрыі. Нарэшце, 25 ліпеня 1934 года меў месца фашысцкі путч. Ён папярэдняе паражэнне, па-першае, з прычыны супраціўлення аўстрыйскай буржуазіі, з галоўным чынам з-за супраціўлення іншых краін.

Кіруючыя колы аўстрыйскай буржуазіі разумеюць, што ў выпадку далучэння Аўстрыі да Германіі Аўстрыю чакае лёс Баварыі і іншых асобных германскіх зямель. Іменна таму аўстрыйскія буржуазныя партыі ўпарта супраціўляюцца планам урада Гітлера. Вялікую ролю адыграла і імкненне ўтрымаць цёплыя месцінкі ў дзяржаўным апараце, уніканць разгрому аўстрыйскіх буржуазных палітычных партый і уніфікацыі іх па германскаму ўзору.

Але асноўную ролю адыгралі тут перашкоды знешне-палітычныя. Італія рушыла свае войскі да аўстрыйскіх граніц, і германскі фашызм апынуўся перад перспектывай вайны, да якой ён не быў яшчэ гатоў. Германскі фашызм адступіў.

На працягу 1935 года германскі фашызм быў больш стрыманым у аўстрыйскім пытанні: у 1936 годзе — пачатку 1937 года становішча зноў змянілася. Змянілася, перш за ўсё, у сувязі з новай роляй Італіі ў Еўропе.

Італія, не адмаўляючыся ад кантакта з Германіяй, паколькі гутарка ішла аб выступленнях супроць версальскай сістэмы і французскага ўплыву ў Еўропе, язмянна абзарачвалася супроць Германіі, калі тая працягвала рукі да паўднёва-ўсходняй Еўропы. Гэта адбывалася па той простай прычыне, што Італія сама імкнецца да панавання ў балкана-дунайскіх краінах. Узмоцненая актыўнасць Германіі пасля прыходу да ўлады ўрада Гітлера прывяла нават да збліжэння Італіі з Францыяй на аснове ўзаемнага нежадання дапусціць далучэння Аўстрыі да Германіі.

Пасля італа-абісінскай вайны становішча мяняецца. Італія па-ранейшаму адносіцца адмоўна да германскага пранікнення ў паўднёва-ўсходнюю Еўропу. Будучы, аднак, значна аслаблена вайной, і ўстрывожаная ўзбраеннямі Англіі, Італія, як відаць, проста не ў стане змагацца на два франты і надзвычайна аслабіла сваё супраціўленне германскім дамаганням у паўднёва-ўсходняй Еўропе. Больш таго, сваё супраціўленне гэтым дамаганням Італія прынесла ў афіару кантакту з Германіяй, дагаварваючыся з апошняй аб сумеснай інтэрвенцыі ў Іспаніі, аб сумесных кроках у адносінах да Англіі і Францыі, да заходне-еўрапейскага пакта і інш.

Спрыяючая пазіцыя Італіі дапамагла Германіі заключыць з Аўстрыяй славутую згоду ад 11 ліпеня 1936 г. Згода гэта мае на паперы абяцанне аб неўмяшанні ў аўстрыйскія справы, але на справе яна адкрывае магчымасці для пашырэння падрыўной работы германскага фашызма ў Аўстрыі.

Германская дыпламатыя дазваляе сабе адкрыта ўмешвацца ў аўстрыйскія справы. Германскі пасол у Рыме ф. Гасель забіўся адклікання з Вены загадчыка аддзелам друку італьянскай місіі ў Вене Марэале, які быў пасрэднікам паміж канцлерам Шушнігам і італьянскім урадам і арганізоўваў пропізеляне гітлераўскай работы ў Аўстрыі. Як паведамляе ліберальная англійская газета «Манчэстэр гарыян», у Граны арганізавана новая гітлераўская арганізацыя «Эстмаркішэр фолксфэрэйн», задача якой заключаецца «ў выхаванні аўстрыйскага народу ў германскім нацыянальным духу». Гэта арганізацыя павінна мець 980 філіялаў у Аўстрыі.

Яшчэ большае, бадай, значэнне маюць весткі аб эканамічным пранікненні Германіі ў Аўстрыю. У прайшоўшым 1936 годзе гандаль Германіі з Аўстрыяй нязначна павялічыўся параўнальна з 1935 годам, аб чым гаворыць наступныя лічбы.

Доля Германіі ў аўстрыйскім імпарце ў 1935 г. складала 16,5 проц., ў 1936 г. — 16,8 проц. Доля Германіі ў аўстрыйскім экспарце ў 1935 годзе складала 15,6 проц., у 1936 г. — 16,1 проц.

Пасля заключэння ліпеньскай палітычнай згоды, зараз-жа пачаліся гандлёвыя перагаворы. Гэтыя перагаворы наштурхнуліся на значныя пяжкасці. У замежным друку многа пісалася аб тым, што наўрад ці ўдасна дасягнуць згоды. Аднак, нарэшце, згода была дасягнута і падпісана 27 студзеня 1937 г. германскім паслом фон Папенам і аўстрыйскім статс-сакратаром па замежных справах Гвіло Шмітам.

Згода прадугледжвае ўзаемнае прадастаўленне кантынгентаў. Германія прадастаўляе Аўстрыі кантынгенты для ўвозу ўбойнай жывёлы, племянной жывёлы, коней, масла, сыру, малака, малочных прадуктаў, лесу, а таксама прамысловых вырабаў, у першую чаргу для вырабаў жалезаапрацоўчай і сталеліцейнай прамысловасці. Аўстрыя прадастаўляе Германіі кантынгенты, у першую чаргу для ўвозу прамысловых вырабаў.

Германія расплачваецца таварамі. У выпадку перавышэння экспарта над імпартам, адпаведныя сумы выкарыстоўваюцца для ўзмацнення германскага турызма ў Аўстрыю.

Значэнне гэтай згоды заключаецца ў тым, што Аўстрыя, побач з іншымі краінамі паўднёвага ўсходу Еўропы, становіцца пастаўшчыком сыравіны і харчу для Германіі. Метад разлікаў аблягчае Германіі ўмацоўваць свой уплыў у Аўстрыі. Германія безумоўна будзе навязваць Аўстрыі ўзбраенне ва ўплату за купленыя тавары. Далей Германія атрымлівае магчымасць даваць ільготы тым фірмам, якія прытрымліваюцца гітлераўскай арыентацыі. Другімі словамі, аўстра-германская гандлёвая згода дае Германіі даволі значныя магчымасці для ўзмацнення свайго ўплыву ў Аўстрыі.

Супраціўляемасць аўстрыйскай буржуазіі палітыцы Германіі, зразумела, не знішчана, аднак, яна значна аслабла. Даволі ўказаць на тое, што аўстрыйскі ўрад дазволіў стварэнне памянёнай намі гітлераўскай арганізацыі «Эстмеркішэр фолксфэрэйн». Далей, аўстрыйскі ўрад зняў, устаноўлены ў свой час дзяржаўны кантроль над гітлераўскай арганізацыяй «Турнфэрэйн», якая фармальна з'яўляецца спартыўным саюзам, а ў сапраўднасці займаецца не столькі спортам, колькі падрыўной работай. Далей, па амністыі ў даны момант вызвалена 18.000 гітлераўцаў, тут-жа аднавіўшых сваю падрыўную дзейнасць.

Новая актыўнасць германскага фашызма ў Аўстрыі заслугоўвае пільнай увагі з боку грамадскасці краін, зацікаўленых у непарушэнні міру. Дзейнасць Германіі ў Аўстрыі з'яўляецца толькі звяном у агульнай падрыўной рабоце Германіі на паўднёвым усходзе Еўропы. Германія пагражае Чэхаславакіі, Германія інтрыгуе ў Румыніі, прапягваючы свае рукі да румынскай нафты і спадзяючыся атрымаць у Румыніі граніцу ў крэдыт для нападу на Совецкі Саюз. Германія, апіраючыся на свае эканамічныя сувязі, прабуе адарваць Югаславію ад Малай Антанты. Германія, карыстаючыся аслабленнем актыўнасці Італіі на паўднёвым усходзе Еўропы, узмацняе свой уплыў у Венгрыі і Баўгарыі.

Не выключана, што ўлік велізарнага росту магутнасці совецкай дзяржавы і небяспекі антысовецкіх авантур прымушае Германію шукаць больш лёгкіх шляхоў для сваёй экспансіі, што Германія імкнецца ў даны момант, у першую чаргу падняволіць паўднёва-ўсходнюю Еўропу або шляхам заваявання яе знутры, або шляхам малой вайны, спадзяючыся, што такая малая вайна не выкліча супраціўлення з боку Англіі і Францыі.

У Англіі ёсць у даны момант людзі, якія лічаць, што Германію можна было-б часткова насыціць і адцягнуць ад агрэсіўнай дзейнасці на захадзе іменна шляхам прадастаўлення магчымасці экспансіі ў паўднёва-ўсходняй Еўропе, іменна шляхам малой вайны. Аднак горкае будзе расчараванне тых людзей, якія малююць сабе падобнага роду ілюзіі. Сэнс германскага пранікнення ў Аўстрыю і ў паўднёва-ўсходнюю Еўропу заключаецца ў тым, каб атрымаць сыравіну, неабходную для германскіх узбраенняў, для таго, каб разграміць саюзнікаў Францыі, каб аблягчыць сабе шлях для шырокіх заваяваўчых дзеянняў на захадзе і ўсходзе Еўропы.

Узмацненне германскай актыўнасці ў Аўстрыі не можа не выклікаць сур'ёзных апасенняў у краінах, зацікаўленых у захаванні міру. Задача гэтых краін заключаецца ў тым, каб перашкодзіць ператварэнню даліны Дуная ў плацдарм для багатых грозным выпікамі авантур германскага фашызма.

В. ХАРВАЦКІ.

P. S. Праўда, за апошні час вызначыліся некаторыя сімптомы зрухаў ва ўзаемаадносінах Германіі і Аўстрыі. Нядаўна аўстрыйскі канцлер Шушніг наведаў Будапешт і вёў перагаворы з венгерскім урадам. Аўстрыя, як быццам, імкнецца выйсці з таго становішча, у якім яна аднайшлася ў выніку збліжэння паміж Германіяй і Італіяй.

Пэўнае значэнне мае адхіленне ад паста аўстрыйскага міністра аховы ўнутранай бяспечнасці Нейштэтэра-Шпюрмера — вядомага прыхільніка Германіі. Калі будапештскі візіт Шушніга выклікаў прыкметную падазронасць у Берліне, дык адстаўку Нейштэтэра-Шпюрмера геманскі друк пэўна звязвае з пазіцыяй тых кіруючых колаў Аўстрыі, якія выступаюць супроць росту германскага ўплыву.

Газета «Берлінер берзенцайтунг» піша, што змена міністра супала з выступленнем ад 11 ліпеня 1936 года. Жыццё пакажа, як будуць развівацца гэтыя зрухі, ці зразумеюць кіруючыя колы аўстрыйскай буржуазіі вялікую небяспеку, якая пагражае іх краіне ў выпадку далейшага збліжэння з Германіяй.

РОСТ НАРОДНЫХ ЗБЕРАЖЭННЯЎ У БССР

Велізарныя поспехі сацыялістычнага будаўніцтва забяспечылі нябачаны ўздым дабрабыту працоўных Совецкага Саюза. Яркай ілюстрацыяй гэтага ўздыму з'яўляецца рост збераж энняў працоўных у ашчадных касах. 360.000 укладчыкаў хаваюць у ашчадных касах БССР 92 мільёны рублёў. На працягу апошніх год няўхільна растуць уклады працоўных у ашчадныя касы рэспублікі. За апошнія толькі 2 гады (1935—1936) сума ўкладаў павялічылася з 39 да 92 мільёнаў рублёў. За адзін толькі 1936 год сярэдні размер укладу павялічыўся з 154 да 254 рублёў, або на 65 проц.

Высокія заработкі, якія ідуць з сабой стаханаўскі рух як у горадзе, так і на вёсцы, заметна адбіліся па прытоку ўкладаў.

Уклады рабочых у 1936 г. павялічыліся супроць 1935 г. на 10.618 тыс. руб., калгаснікаў — на 3.798 тыс. руб.

Як абстаіць справа ў першым квартале гэтага года? Калі лічыць усе велізарныя магчымасці прыцягнення народных збераж энняў у ашчадныя касы БССР, то вынікі гэтай работы ў першым квартале трэба прызнаць зусім недастатковымі.

Ашчадныя касы БССР адстаюць ад ашчадных кас іншых саюзных рэспублік у прыцягненні ўкладаў. Гэта тлумачыцца тым, што многімі ашчадныя касамі, у асаблівасці на вёсцы, справа збераж энняў недастаткова папулярызуецца сярод насельніцтва. Ашчадныя касы яшчэ не ўсюды культурна абсталяваны, не ўсе работнікі ашчадных кас культурна і ўважліва абслугоўваюць укладчыкаў. Узяць, напрыклад, ашчадную касу № 2758/011 у вёсцы Мормаль, Жлобінскага раёна. Цесната, бруд, наведвальніку не толькі няма дзе прысесці, але нават пастаяць не заўсёды можна, бо ўся плошча для наведвальнікаў займае адзін квадратны метр. Указальнікаў, дзе знаходзіцца ашчадная каса, а таксама аб галзінах яе работы ў вёсцы не знойдзеш. Гэта ў той час, калі ў вёсцы Мормаль — больш 200 калгасных двароў, сярэдняя і няпоўная сярэдняя школы, блізка чыгуначная станцыя, будуецца МТС.

Не лепш працуюць ашчадныя касы № 5986/02 ў вёсцы Забалышано і № 5986/03 у вёсцы Бохань, Хоцімскага раёна.

Культурна захоўваць свае збераж энні — гэта значыць захоўваць іх у ашчаднай касе. Гэта не толькі мае вялікае значэнне для фінансавання нашай народнай гаспадаркі, але і выгодна і зручна для саміх укладчыкаў.

Ашчадныя касы БССР прымаюць уклады ад усіх грамадзян і выдаюць па першаму патрабаванню, часткай або поўнасцю увесь уклад. Укладчыку забяспечваюцца ахова, недатыкальнасць і поўная тайна ўкладаў. Укладчык можа завяшчаць свой уклад законнаму наследніку, або іншай асобе ці арганізацыі. Ашчадныя касы выконваюць усе распараджэнні укладчыкаў аб пераводзе часткі ўклада або ўсяго ўклада ў іншыя ашчадныя касы, а таксама на рахункі асоб і арганізацый, і аплачваюць акрэдытывы.

Укладчыкі за хаванне ў ашчадкасе сваіх збераж энняў атрымліваюць прэміі. Толькі за адзін 1936 год ашчадкасы БССР выплацілі укладчыкам 3.929.962 р. прэміі. Велізарныя задачы па прыцягненню збераж энняў насельніцтва ашчадныя касы змогуць паспяхова вырашыць толькі пры культурным і ўважлівым абслугоўванні ўкладчыкаў і пры штодзённай дапамозе з боку ўсёй совецкай грамадскасці нашай рэспублікі.

І. С. ФАБРЫКАНТ.

КАНЦЭРТЫ ЗАКА І ТАМАРКІНАЙ У МЕНСКУ

Беларускае кіраўніцтва па справах мастацтваў звярнулася ва Ўсесаюзны камітэт па справах мастацтваў з просьбай дазволіць арганізаваць у Менску канцэрты совецкіх піяністаў Якава Зака і Розы Тамаркінай — пераможцаў міжнароднага шапенаўскага конкурса ў Варшаве. Усесаюзны камітэт даў згоду. Канцэрты адбудуцца ў Беларускай Дзяржаўнай філармоніі пры звароце піяністаў з Польшчы ў канцы сакавіка.

Заняткі ў вышэйшай школе прапагандыстаў пры ЦК КП(б)Б. Фото Я. Салавейчыка.

Першы выпуск прапагандыстаў

Вышэйшая школа прапагандыстаў выпускае першую групу прапагандыстаў у колькасці 24 чалавек.

2 гады знаходзіліся яны ў сценах школы і пераважную частку гэтага часу аддалі рабоце над класікамі марксізма-ленінізма, рабоце над творамі Маркса—Энгельса — Леніна — Сталіна. Многа часу было адведзена таксама практычнай рабоце ў гуртках партыйна-комсамольскай асветы г. Менска.

Сярод выпускаемых — 6 чалавек з партыйным стажам 14—18 год. Многія да школы былі на прапагандысцкай рабоце, або штатнай, або кіравалі гурткамі партыйнай асветы. У школе яны ўзяліся за сур'ёзнае вывучэнне твораў Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна. Многія з курсантаў толькі ў школе пачалі практычна працаваць у гуртках партыйнай асветы.

Перад школай прапагандыстаў ЦК КП(б)Б была пастаўлена задача падрыхтаваць высокакваліфікаваных прапагандыстаў, выкладчыкаў па гісторыі партыі і ленінізму ў сетцы партыйнай і комсамольскай асветы, загадчыкаў культпропаў, прапагандыстаў-арганізатараў і загадчыкаў партгабінетамі акругкомаў, горрайкомаў і парткомаў КП(б)Б.

Камандыруемыя на практычную работу выпускнікі могуць быць выкарыстаны ў пераважнай частцы інструктарамі райкомаў па партыйнай асвеце, райпрапагандыстамі, загадчыкамі райпартгабінетаў, а асобныя таварышы — загадчыкамі культпропаў райкомаў.

Не гледзячы на буйныя недахопы, якія мелі месца ў рабоце школы, студэнты значна вырасліў ідэйна-палітычных і тэарэтычных адносінах: многія з выпускаемых набліліся выдатных і добрых паказальнікаў у вучобе (Перчонак, Квасніцкі, Шэрман, Мачульскі, Чарняк, Беленчыкаў, Івашкевіч і інш.).

Да карэнных недахопаў, якія ў значнай ступені тармазілі работу па высокаякаснай падрыхтоўцы прапагандысцкіх кадраў, трэба аднесці перш за ўсё пытанне камплектавання.

Пры арганізацыі школы не было пільнага падбору кандыдатур як па партыйнасці, гнаў і па іх падрыхтоўцы. У рэзультаце — на працягу першага года вучобы прышлося выключыць значную колькасць слухачоў, або перавесці іх на курсы з меншай праграмай, з меншым аб'ёмам патрабаванняў. З 70 чалавек, якія былі набраны ў школу, к выпуску асталося толькі 24. Пушчаная ў значнай ступені на самацёк справа камплектавання прывяла не толькі да таго, што мясцовыя партарганізацыі накіроўвалі людзей з надзвычайна нізкай падрыхтоўкай або такіх, якія зусім не маюць яе, але і да таго, што ў школу пранікілі і класава-варожыя элементы, выкрытыя як у перыяд праверкі і абмену партыйных дакументаў, так і пасля абмену.

Да другой групы недахопаў неабходна аднесці занадта доўгі, так званы арганізацыйны перыяд. Арганізацыйная навучальнага працэса, у школе, распрацоўкай праграмы работы, камплектаваннем навучальных груп, падборам неабходных педагагічных кадраў не заняліся як належыць да пачатку работы школы. Многія з гэтых пытанняў прыходзілася вырашаць ужо ў ходзе работы школы, прычым станоўчае іх вырашэнне занадта зацягвалася, што не магло не адбіцца на якасці работы.

Не было таксама ўважлівага падбору і выкладчыцкіх кадраў. У школу папалі недастаткова падрыхтаваныя і нават класава-варожыя людзі (Брыт і інш.). Большасць выкладчыкаў працуюць па сумяшчальніцтву, а гэта таксама адзін з істотных недахопаў. За перыяд работы школы па курсу гісторыі ВКП(б) змянілася рад лектараў. Курс гісторыі ВКП(б) пачаў чытаць т. Пасэ, яго змяніў Зюськой, а Зюськова змяніла Мееровіч. Зразумела, гэта не магло не даць свае адмоўныя вынікі. Большасць выкладчыкаў школы не займаюцца вывучэннем і выхаваннем слухачоў.

ЦК ВКП(б) указаў на гэтыя карэнныя недахопы, якія тармозяць падрыхтоўку прапагандысцкіх кадраў. Выконваючы ўказанні ЦК ВКП(б), ЦК КП(б)Б, у прыватнасці аддзел партыйнай прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б, прыняў рад мер для знішчэння ўказаных недахопаў.

Зараз праводзіцца перш за ўсё дэтальны адбор камандыруемых на вучобу. Кожная кандыдатура зацвярджаецца бюро ЦК КП(б)Б. Значна палепшана матэрыяльнае становішча слухачоў — стыпендыя павялічана з 250 да 450 руб.

Пастановай бюро ЦК КП(б)Б да школы прымацаваны пастаянныя выкладчыкі, хоць пытанне аб сумяшчальніцтве ўсё яшчэ з'яўляецца балючым месцам у рабоце школы. Пачата будаўніцтва вучэбнага корпуса для школы, які забяспечыць неабходныя ўмовы для работы.

На сённешні дзень школа яшчэ знаходзіцца ў стандартных дамах на тэрыторыі былой сельскагаспадарчай выстаўкі. Слухачам школы пераважную частку свайго навучальнага часу неабходна працаваць над класікамі марксізма-ленінізма самастойна. Умоў для гэтай работы яны не маюць. Занадта вялікая скучанасць, незабяспечанасць навучальнай плошчай. Тэмпература ў памяшканні зімой мяняецца ў залежнасці з напрамкам і сілай ветру. Няма вучэбных габінетаў, чытальняў. Слухачам прыходзіцца працаваць у інтэрнатах, што, бясспрэчна, адбіваецца на якасці вучобы.

Вось недахопы ў рабоце школы першага склікання. Пры камплектаванні другога склікання школы гэтыя недахопы неабходна ўлічыць і ліквідаваць, каб паспяхова выканаць указанні ЦК ВКП(б) аб падрыхтоўцы прапагандысцкіх кадраў.

КЛІМАЎ,
нам. дырэктара вышэйшай школы прапагандыстаў пры ЦК КП(б)Б.

ШКОЛЬНЫЯ ВЕСНАВЫЯ КАНІКУЛЫ Ў БССР

24 сакавіка пачаліся школьныя веснавыя канікулы. Асабліва вялікае ажыўленне ў гэтыя дні ў Паланы піянераў і акцябрат імя Гікало. Штодзенна палац наведваюць тысячы дзяцей. Яны глядзяць кінокарціны, слухаюць лекцыі, гутаркі, прымаюць удзел у вечарах самадзейнасці, іграх.

У школах адбываюцца вечары самадзейнага мастацтва, дзіцячыя ігры. Ва ўсіх кінотэатрах Менска наладжваюцца спецыяльныя кіносеансы для школьнікаў. У часе веснавых канікул у Менску будуць праведзены два вялікія інтэрнацыянальныя дзіцячыя вечары і сустрэча школьнікаў з пісьменнікамі БССР.

ВЫВЕЗЦІ ГАРУЧАЕ

Трактарны парк большасці МТС Совецкай Беларусі вышаў на сваё вытворчыя ўчасткі. Праз некалькі дзён пачнуцца палявыя работы. Цёплае ветранае надвор'е спрыяе хуткаму прасыханню глебы.

Поспех работы трактароў на палях будзе залежаць у першую чаргу ад таго, як машынатрактарныя станцыі забяспечаць сябе гаручым. Урокі мінулага года гавораць аб тым, што там, дзе несвоечасова было завезена гаручае, меліся частыя прастоі трактароў.

У сёлетнім годзе вывазка гаручага ва многіх МТС БССР таксама праходзіць яўна нездавальняюча. Па даных Беларускай рэспубліканскай канторы «Галоўнафта» па сістэме Наркомзема за 20 дзён сакавіка выбрана толькі 53,6 проц. газы і па сістэме Наркомсоўгасаў — 49,1 проц.

На буйнейшых базах, як напрыклад, Бабруйскай, за сакавік выбрана для веснавой сяўбы толькі 19 проц. газы, Барысаўскай — 23 проц., Віцебскай — 25,7 проц., Слуцкай—25,5 проц., Полацкай —26 проц., Менскай — 41,7 проц., Аршанскай — 48,9 проц. На Заслаўскай раённай базе «Галоўнафта» за апошні месяц не выбрана ні аднаго кілаграма гаручага, у Пухавічах і Старых Дарогах выбарка таксама фактычна спынілася.

Яўна недапушчальнае становішча нікога не трывожыць. Ні Наркомзем, ні Наркомсоўгасаў БССР не клапоцяцца, каб трактарны парк быў поўнасцю забяспечан гаручым на ўвесь час веснавых работ. Рад МТС не выбралі газы ў студзені і лютым, не выбіраюць і ў сакавіку.

Асабліва пагражаючае становішча ў многіх глыбінных машынатрактарных станцыях. Вось, напрыклад, Чачэрская МТС у выніку бестурботных адносін дырэкцыі МТС план вывазу гаручага гэтай МТС выканан толькі на 60 проц. У сакавіку не выбрана ні аднаго кілаграма. Транспарт, які ёсць у яе распараджэнні, не мабілізаван, тара пустуе.

Не лепш у Доўскай, Гомельскай, Кіраўскай, Церахаўскай і інш. машынатрактарных станцыях Бульбяна-агароднага кіраўніцтва Наркомзема БССР. У гэтым кіраўніцтве так і заяўляюць: «Мы не можам выбраць гаручае, бо нехапае тары». Ці толькі справа ў тары? Справа ў тым, што з боку Наркомзема няма кіраўніцтва глыбіннымі МТС. Гэта давяло да таго, што ў сакавіку план вывазкі гаручага па МТС Бульбяна-агароднага кіраўніцтва выканан толькі на 41 проц.

З месяца ў месяц зрываецца вывазка ліграіна. У студзені і лютым план выканаў не больш чым на 50 проц., а ў сакавіку — 29,4 проц. Зноў паўтараюцца ўрокі мінулага года, калі з-за недахопу ліграіна дзесяткі магутных трактароў «ЧТЗ» прастойвалі без работы. Аднак Наркомзем БССР не вынес з гэтага ўрока патрэбнага вываду.

Многія МТС не забяспечаны тарай. Наркомзем БССР таксама не прыняў патрэбных мер, каб мабілізаваць тару на мясцах. Да гэтага часу таксама не наладжана акрэдытаванне МТС на выкупку гаручага. Заслаўская, Церахаўская і інш. МТС не выбіраюць толькі таму, што няма грошай.

Яшчэ горшае становішча ў новых МТС. Па ільняному кіраўніцтву Наркомзема налічваецца 12 станцый, арганізаваных у гэтым годзе. Ні адна гэтая МТС не забяспечыла сябе гаручым. У глыбінныя МТС, як напрыклад, Задвінскую, Суражскага раёна, Добрамысліцкую, Лёзнянскага раёна, Бельскую, Полацкага раёна і інш. не завезена ні аднаго кілаграма гаручага. Новыя МТС не забяспечаны тарай. Наркомзем забыўся аб існаванні гэтых МТС.

Далей такое становішча нецярпіма. Трэба ў бліжэйшыя дні да пачатку палявых работ поўнасцю вывезці ўсё гаручае. Наркомзем і Наркомсоўгасаў БССР роўна з МТС і соўгасамі нясуць адказнасць за своечасовую вывазку гаручага.

С.

НЕ ГАТОВЫ ДА НАВІГАЦЫІ

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). У кабінеце начальніка гомельскага суднарамонтнага завода вывешан графік ходу работ па рамонту суднаў. Лінія капітальнага і бягучага рамонту 15 сакавіка ўперліся ў лічбу 100 проц. Гэта па графіку, на паперы.

Давайце заглянем у порт, дзе схаваліся ад ледаходу судны, «адрамантаваныя» заводам. Ужо з першага погляду нават нявопытны чалавек не вытрымае, каб не сказаць—очкаўцірацелі.

У затоне порта стаіць цэлая эскадра пасажырскіх і буксірных параходаў, вялікіх і малых суднаў. Яны грамозяцца адно каля другога, штурхаюцца, стукаюцца борт аб борт. А па суднах ліхарадачна бегаюць людзі розных водніцкіх рангаў. Тут вы ўбачыце маляроў, плотнікаў, слесароў і нават самаго Ваўкагона — начальніка сектара суднарамонта Дняпра-Дзвінскага рачного пароходства.

Вясна гомельскіх воднікаў застала непадрыхтаванымі. Ні адно судно поўнасцю не гатова да выхаду ў плаванне.

Па раскладу пароход «Лівер» 24 сакавіка павінен выйсці ў першы рэйс. Аднак яшчэ 22 сакавіка гэты пароход далёка не гатоў быў да выхаду ў плаванне. Не пафарбавана падлога, не адрамантавана верхняя палуба і пры дажджы вада трапіць у сярэдзіну судна. Маляры толькі цяпер, за 2 дні перад выхадам парахода, фарбуюць сцены. Вакол бруд, смецце, няма мэблі. Маса недаробак, з якімі пускаць судно ў плаванне сорамна і небяспечна. Мы ўжо не кажам аб тым, як будзе адчуваць тут сябе пасажыр, апынуўшыся ў такім параходзе.

Гэта, па запэўненнях кіраўніцтва завода, самае «гатовае» судно. Што-ж пасля гэтага можна сказаць пра астатнія судны?

Рамонт суднаў у Гомелі фактычна правалены. На гомельскім заводзе арудваў трацкіст Агурак, які, будучы дырэктарам завода, усяляк шкодзіў. Пасля выкрыцця Агурка партарганізацыя завода не мабілізавала рабочых на ліквідацыю шкодніцкай дзейнасці ворага народу. Адсюль і вынік — негатоўнасць да навігацыі.

Зараз у парту бегатня. Тут стараюцца закончыць рамонт так, каб хаця пароход мог выйсці з затону, не звяртаючы ўвагі на «дробязі». Але гэтыя «дробязі» могуць у дарозе выклікаць аварыю і, па меншай меры, выклікаць зрыў графіка руху.

П. Ч.

АБУРАЮЧАЯ БЕЗАДКАЗНАСЦЬ

(Пісьмо пасажыраў)

З вялікімі цяжкасцямі мы дасталі білеты на поезд № 69 на прамы вагон з Віцебска ў Менск. У Оршу мы прыехалі ў 19 гадзін 30 мінут. Тут была перасадка. Праз 8 гадзін наш вагон прычапілі да маршрутнага поезда на Менск. Усе пасажыры спакойна палягалі спаць. Аднак не паспелі ад'ехаць 50 кіламетраў ад Оршы, як ў вагон забег праваднік з крыкам: «Вылязайце хутчэй! Адчаплем вагон, сядайце ў першы папаўшыйся».

Спрасонку людзі ўскочылі перапалоханыя. У вагоне пачалася бегатня і мітусня. Хто гальштук аставіў, хто галошы, пояс, але ніхто не звяртаў увагі на гэтыя дробязі, абы хутчэй выбрацца з вагона, а тут яшчэ затрымка з выдачай білетаў, якія захоўваліся ў праваднika. Многім пераблыталі білеты, з іншым зусім не папала. Пры перасадцы ў другі вагон зноў непаразуменні: праваднікі не пускаюць, ледзь дабраліся да Менска.

3-за безадказнасці работнікаў станцыі Орша, якія за 8 гадзін не маглі аглядзець спраўнасць аднаго вагона, 40 пасажырам давялося панярпець столькі мытарстваў.

ХАНУЦІН.
ФЕЛЕР
КАРПІКАЎ.

ПАРОЧНАЯ СІСТЭМА КІРАЎНІЦТВА ПРОФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ

З нядаўна абдыўшагася працэса нал бандай германа-японскіх трацкісцкіх агентаў фашызма кіраўнікі профсаюзных арганізацый не зрабілі для сябе ўрокаў. Страта пільнасці, самасупакаенне, забраўшта, адсутнасць самакрытыкі, парушэнне профсаюзнай дэмакратыі і наведзанне сваіх кадраў прывялі да вялікай засмечанасці профсаюзнага апарата ворагамі народу.

Старшыні ЦК саюза вышэйшых школ і ЦП саюза швейнікаў Бірыла і Скок аказаліся контрэволюцыянерамі-трацкістамі. У складзе пленума ЦП швейнікаў былі трацкісты і класава-варожыя элементы. Вялікая засмечанасць выяўлена і ў ЦП саюза комунальна-жыллёвага будаўніцтва, БРК саюза лесасплава і інш.

У 1936 годзе б. старшыня ЦСПСБ Кавальчук, які ўтоіў сваё трацкісцкае мінулае, быў знят з работы. Здавалася-б, што кіраўнікі ЦСПСБ павінны былі мабілізаваць усю профсаюзную масу на павышэнне рэволюцыйнай пільнасці і ачыстку апарата профсаюзаў ад ворагаў народу. Але нічога падобнага не здарылася. Тут нават не палічылі патрэбным склікаць пленума, каб вывесці Кавальчука са складу членаў ЦСПСБ. Да гэтага часу ён астаецца членам Цэнтральнага совета профсаюзаў. Не выведзен яшчэ са складу пленума і трацкіст Хейфец — былы рэдактар газеты «Рабочий».

На працягу 4-х год пад носам у ЦСПСБ цэлая шайка злачынцаў, прабраўшыхся ў страхавы пункт, раскрадвала дзесяткі тысяч дзяржаўных сродкаў. Сямейнасць, ігнаравание сігналаў рабочых, заціск самакрытыкі стваралі абстаноўку для беспакаранага і адкрытага дзеяння злачынцаў.

ЦСПСБ распаніў гэты факт, як просты крадзёж, не зрабіўшы з гэтага ніякіх палітычных вываў, не разгледзеўшы, што за гэтымі дзеяннямі ўтойваюцца ярыя класавыя ворагі.

Пачынаючы з ЦСПСБ і да цэнтральных праўленняў саюзаў і нізавых камітэтаў, мы на кожным кроку сустракаемся са шматлікімі фактамі грубейшага, бесцэрэмоннага парушэння профсаюзнай дэмакратыі.

Апошнія выбары ЦСПСБ адбыліся ў 1932 годзе. З таго часу амаль увесь склад пленума змяніўся. 24 чалавекі кааптаваны. У складзе прэзідыума асталося толькі тры абраных члены, а 8 кааптавана. Ні аднаго стаханаўца ў прэзідыуме няма.

З 1935 года не збіраўся пленум ЦСПСБ. Члены пленума ні за якой работы не прыцягваюцца. Аб іх проста забыліся. У апараце ЦСПСБ затрудняюцца нават назваць іх прозвішчы.

ЦСПСБ паказаў дрэнны прыклад ніжэйшаму профсаюзным арганізацыям. Многімі цэнтральнымі праўленнямі, раённымі і гарадскімі профсоветамі, фабрычна-заводскімі камітэтамі кіруюць людзі, якія нікім не абраны.

Старшыня Беларускага рэспубліканскага камітэта саюза леса і сплава т. Юдовіч не абіраўся профсаюзнай масай.

Старшыня ЦП саюза швейнікаў т. Клябанаў і яго намеснік Грэк таксама не абіраліся.

Старшыня гомельскага горпрофсовета т. Шапіра чаверты год працуе на гэтай пасадзе і таксама не быў абран.

Парторг машчанскага ільназавода (Сенненскі раён) Пятроў, папіраючы элементарныя патрабаванні профсаюзнай дэмакратыі, без удзелу заўкома правёў перавыбары заводскага камітэта, не заслухаўшы справаздачы аб рабоце мінулага складу. Пад нашскам парторга старшынёй заўкома быў абран... не член профсаюза, нейкі Салаўёў.

Са спісу членаў пленума мозырскага райпрофсовета зусім выкрэслены абраныя з'ездам тт. Мінчук, Сталярчук, Лапсман, Сафронаў і Кніжонак. Між тым, усе гэтыя людзі працуюць у Мозыры да гэтага часу. Кааптаван-жа ў склад пленума райпрофсовета 31 чалавек.

Зусім нядаўна на менскім заводзе імя Молатава адбыліся выбары новага старшыні заўкома. На сходзе прысутнічала менш адной трэцяй часткі рабочых. Аднак, выбары адбыліся.

У радзе буйнейшых гарадоў БССР (Мозыр, Магілеў, Бабруйск, Орша) зусім ліквідаваны горпрофсоветы. У арганізаваных яшчэ ў 1935 годзе 4-х акругах ужо даўно прайшло афармленне ўсіх акруговых арганізацый, а ЦСПСБ «не паспеў» нават стварыць там оргбюро.

Як ЦСПСБ, так і нізавыя камітэты не робяць справаздач перад выбаршчыкамі. Рабочыя заводаў імя Варашылава, Молатава, Кірава і інш. не памятаюць такога выпадку, каб за апошнія чатыры гады хаця-б адзін член прэзідыума ЦСПСБ або цэнтральнага праўлення саюза рабілі справаздачы аб сваёй рабоце.

ЦСПСБ і рад цэнтральных праўленняў саюзаў не кіруюць стаханаўскім рухам, не ведаюць аб патрэбах стаханаўцаў. У парадку дня прэзідыума ЦСПСБ ні разу не стаяла гэта пытанне. Тут рэдка сустракаюцца са стаханаўцамі, не ведаюць іх.

Дзесяткі вядомых стаханаўцаў Беларусі — Скабло, Мільбоер, Лысёнак і інш. — жывуць у дрэнных кватэрах, але профсаюзныя арганізацыі нічога не робяць, каб палепшыць іх кватэрныя ўмовы. Яны нагул не клапоцяцца аб культурна-бытавых умовах рабочых. Ужо колькі часу ідзе пяганіна з прадастаўленнем кватэры знатнаму стаханаўцу фабрыкі імя Кагановіча — дэлегату Надзвычайнага VIII Усесаюзнага З'езда Советаў т. Скабло. Але да гэтага часу кватэра яму не прадастаўлена.

На пасяджэннях прэзідыума ЦСПСБ у большасці сваёй разглядаюцца заявы аб пасылцы на курорт, у дамы адпачынку, аб вызначэнні пенсіі (дарэчы, пуцёўкі выдаюцца незаконна па запісках і рэкамендацыях адказных работнікаў). Рашэнні прэзідыума па сутнасці непраўдзівы. З 11 членаў прэзідыума на пасяджэннях прысутнічае 3—4. Многа пытанняў рашаецца, наогул, без пасяджэння, а шляхам апытання.

Ніводнай справаздачы ЦП саюза, райпрофсовета і заўкома ЦСПСБ не заслухаў. Ён і не правярае іх работу. Таму зусім не дзіва, што кіраўнікі Цэнтральнага совета профсаюзаў часта апыняюцца перад здарыўшымися фактамі злоўжывання, раскрадання профсаюзных грошай (ЦК саюза хлебапячэння, МТС і інш.). Бескантрольнасць прыводзіць да поўнай бяздзейнасці профсаюзнага апарата.

На шматлікія сігналы з прадпрыемстваў аб абліках рабочых, аб незахаванні законадаўства аб ахове працы і запушчанасці справы ліквідацыі непісьменнасці ЦСПСБ не зварачвае ўвагі.

У профсаюзах яшчэ не створан шырокі лабраяхвотны актыў. У ЦСПСБ няма ні водната лабраяхвотніка-актывіста. Сакратар ЦСПСБ тав. Гераўкер усё яшчэ толькі збіраецца заняцца стварэннем гэтых кадраў.

Старшыні раду горпрофсоветаў (гомельскі, барысаўскі) звярталіся за дапамогай у ЦСПСБ па вырашэнню важнейшых пытанняў: аховы працы, соцстраху, лікбезу. Але дарэмна, ніякага адказу яны не атрымалі.

Па ўсёй краіне шырока разгарнулася хваля большэвіцкай самакрытыкі. Мільённыя масы працоўных, вывучаючы рашэнні Пленума ЦК ВКП(б), дапамагаюць партыйным арганізацыям выкрыць шматлікія недахопы, агіднасці, дзеянні класавых ворагаў. Не закранула гэта толькі профарганізацыі Беларусі на чале з ЦСПСБ. Нават сход партыйнай арганізацыі ЦСПСБ, прысвечаны вынікам Пленума, прайшоў на нізкім палітычным узроўні, пры зусім слабай актыўнасці і самакрытыцы.

Не так даўно рэўкамісія ЦСПСБ правярыла пенсійныя справы і знайшла рад недахопаў. Сакратару ЦСПСБ т. Гераўкеру гэта не спадабалася, і на прэзідыуме былі адвергнуты вывады рэўкамісіі, не маючы на гэта ніякіх правоў і паўнамоцтваў.

Профсаюзы Беларусі лічаць для сябе недастойным займацца скаргамі працоўных. Ці не злачынства гэта, калі ЦСПСБ перадаверыў такі адказны ўчастак тэхнічнаму работніку, які, па сутнасці, ператварыўся ў своеасаблівага рассартыроўшчыка паступаючых скаргаў па розных інстанцыях? Справа даходзіць часамі да курёзаў. Нядаўна паступіла ў ЦСПСБ заява ад рабочых цагельнага завода № 1—3, дзе яны скардзіліся на дрэнную арганізацыю лікбеза, што старшыня заўкома груба адносіцца да іх, што ЦП саюза керамікаў нічым не дапамагае заводу. І што вы думалі? Гэта самая заява пасля доўгага марынавання (месяц) перасылаецца ў тое-ж ЦП саюза керамікоў для... рэагавання.

Такая бюракратычная сістэма і напляваецельскія адносіны да заяў членаў саюза існуе і ў ЦП саюзаў.

15 мая мінулага года ў ЦК саюза пачатковых і сярэдніх школ паступіла хадайніцтва прафкома магілеўскага педрабфака аб выдачы пуцёўкі ў санаторый «Сасноўка» для хворай студэнткі т. Манёнак. Не дачакаўшыся адказу, прафком праз паўтары месяцы зноў напамінае ЦК аб гэтым. Але-ж пуцёўкі так і не высылалі. У той-жа час дырэктар рабфака Лашкевіч незаконна адымае стыпендыю з хворай студэнткі. Цяжка хворая дзяўчына, былая батрачка і дачка калгаснікі, бачачы бязлітасна прафсаюзных бюракратаў, напісала пісьмо ў другія арганізацыі.

Гэта заява паступіла для рэагавання ў ЦСПСБ. Тут адразу-ж спіхнулі яе ў той-жа ЦК саюза. Адсюль пачынаецца кругаварот. Заява плыве ад адной інстанцыі да другой, ад аднаго чыноўніка да другога, а пуцёўкі ўсё не высылаюць. Манёнак памёрла, так і не дачакаўшыся пуцёўкі.

Сотні скаргаў ляжаць у папках ЦСПСБ і ЦП саюзаў без усякага руху. Тут стараюцца абы збыць іх з рук і хутчэй вываліцца ад надакучлівых скаржнікаў. Палітычныя слепцы не бачаць, што за кожнай скаргай стаіць жывы чалавек, грамадзянін вялікай сацыялістычнай радзімы.

Аб «рабоце» профсаюзаў красамоўна гаворыць і такі факт, што з 579.120, працуючых на вытворчасці і ва ўстановах БССР, больш 100.000 чалавек не ахоплены членствам профсаюза.

Уся «дзейнасць» профсаюзаў Беларусі сведчыць аб тым, што сучасны склад ЦСПСБ не здольны кіраваць профсаюзнымі масамі, што ён адарваўся ад іх і не можа выканаць велізарныя задачы, якія пастаўлены перад профсаюзамі ў сучасны перыяд палітычнага пераўтварэння ў краіне.

Р. ДОДЗІН.
І. ТУРЭЦКІ.

ЗАЯВА тав. МАЙСКАГА

НА ПАСЯДЖЭННІ МІЖНАРОДНАГА КАМІТЭТА ПА НЕЎМЯШАННЮ

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 25 сакавіка. (БЕЛТА). Учора ўвечары адбылося пленарнае пасяджэнне міжнароднага камітэта па неўмяшанню ў справы Іспаніі, на якім прадстаўнік СССР тав. Майскі зрабіў наступную заяву:

«У адпаведнасці з інструкцыямі мэйго ўрада я лічу неабходным звярнуць увагу камітэта на ўсё ўзрастаючую ваенную інтэрвенцыю Італіі ва ўнутраныя справы Іспаніі. Згодна зусім даставерных даных, якія ёсць у маім распараджэнні, лік італьянцаў, якія знаходзяцца ў Іспаніі, у сярэдзіне лютага быў ніяк не меншы 60 тысяч. Я маю дастатковыя падставы думаць, што з таго часу гэта лічба значна павялічылася; аднак, я знарок прытрымліваюся мінімальнага вылічэння італьянскіх узброеных сіл у Іспаніі, каб не даваць падставы абвінавачваць мяне ў жаданні ваўмысля пераўвялічваць сур'ёзнасць стварыўшагася становішча.

Так званыя італьянскія «валянцёры», аб якіх ідзе гутарка, прыбывалі ў Іспанію не ў дзіночку ці маленькімі групамі, а дастаўляліся туды вялікімі масамі, у ваенных фарміраваннях, пад камандай італьянскіх афіцэраў і генералаў, багата забяспечаных усімі відамі зброі і амуніцыяй італьянскага паходжання. Не падлягае сумненню, што па крайняй меры вельмі значная частка названых ваенных фармаванняў складаецца з часцей італьянскай рэгулярай арміі.

Усе гэтыя факты палкам апраўдваюць сцвярджэнне, што цяперашнія дзеянні італьянскага ўрада на Піранейскім поўвостраве прадстаўляюць сабой адзін з найбольш яркіх прыкладаў іншаземнай інтэрвенцыі, вядомых у гісторыі. Больш таго, калі прыняць пад увагу размеры узброеных сіл, пушчаных у ход італьянскім урадам, то ёсць усе падставы характарызаваць дзеянні Італіі як ваеннае нападзенне на чужую краіну і як акт нічым не правакаванай агрэсіі супроць іншай дзяржавы ў тым сэнсе, як гэта разумеецца міжнародным правам і статутам Лігі нацый.

Шырокая інфармацыя, якая пацвярджае правільнасць усяго вышэйсказанага, з дня ў дзень друкавалася на працягу апошніх тыдняў ва ўсім сусветным друку. Вялікая колькасць зусім дакладных і дэтальных фактаў таго-ж парадку сабрана ў ноце іспанскага ўрада ад 13 сакавіка, адрасаванай брытанскаму і французскаму ўрадам, копія якой была ўручана таксама Народнаму камісарыяту па замежных справах у Маскве. У гэтай ноце іспанскі ўрад выражаў жаданне, каб камітэт па неўмяшанню ў самым тэрміновым парадку «разглядзеў і вынес меркаванне па абвінавачаннях іспанскага ўрада» супроць італьянскага ўрада ў сувязі з удзелам італьянскіх узброеных сіл у барацьбе супроць законнага ўрада Іспаніі на баку генерала Франко. Адначасова ў той-жа ноце ўрад Іспанскай рэспублікі заяўляў «аб сваёй гатоўнасці аказаць камітэту па неўмяшанню ўсякую садзейнасць у дасягненні ўказанай мэты».

Совецкі ўрад поўнасцю падтрымлівае просьбу іспанскага ўрада аб расследванні фактаў італьянскай інтэрвенцыі ў Іспаніі і лічыць неабходным паставіць данае пытанне на абмеркаванне камітэта па неўмяшанню. Практычныя прапановы совецкага ўрада зводзяцца да наступнага:

Па-першае, у самым тэрміновым парадку расследаваць абвінавачанні, якія змяшчаюцца ў ноце іспанскага ўрада ад 13 сакавіка.

Па-другое, з гэтай мэтаю неадкладна адправіць у Іспанію спецыяльную камісію камітэта, даручыўшы ёй: 1) расследаваць усе выпадкі, калі, у адпаведнасці з маючайся інфармацыяй, італьянскі ўрад ужо пасля 20 лютага (даты апошняга пагаднення аб спыненні пасылкі людзей і зброі ў Іспанію), усё-такі дастаўляў узброеныя сілы і ваенныя матэрыялы генералу Франко; 2) расследаваць усе факты ўдзелу часцей італьянскай рэгулярнай арміі ў ваенных аперацыях супроць іспанскага ўрада; 3) прадставіць камітэту па неўмяшанню даклад аб рэзультатах праведзенага расследвання».

Выступленне тав. Майскага зрабіла ўражанне разарваўшайся бомбы. У першы момант у зале англійскага міністэрства замежных спраў, дзе адбываюцца пасяджэнні пленумаў камітэта, наступіла напружанае маўчанне. Маўчанне гэта, нарэшце, было парушана прадстаўніком Італіі Грандзі, які, моцна хвалюючыся, заявіў, што на «выступленне прадстаўніка комуністычнай Расіі фашысцкая Італія ў свой час дасць належны адказ».

Яго заява, зробленая на пасяджэнні падкамісіі 23 сакавіка аб тым, што ні адзін італьянскі «валянцёр» не пакіне Іспанію да канца грамадзянскай вайны, выклікала цэлую буру ў еўрапейскім і амерыканскім друку і паставіла італьянскі ўрад у даволі непрыглядное становішча. Затое ў бой з закасанымі рукавамі рынуўся прадстаўнік Германіі Рыбентроп, які на ўчарашнім пасяджэнні стаў ужо прама гаварыць ад імя італьянскага ўрада—так далёка зайшла «дружба» паміж Берлінам і Рымам.

Рыбентроп выступіў з доўгай і нудной прамовай па тэму аб Комінтэрне і совецкай прапагандзе і пад канец рэзка атакаваў сусветны друк, які, на яго думку, услужліва прадстаўляе свае старонкі для ўсякага роду «махінацый» з боку СССР. Германскі дэлегат быў асабліва занепакоен той акалічнасцю, што гэты друк пра тое-сёе даведваецца і публікуе ад работе камітэта па неўмяшанню. Рыбентроп патрабаваў прыняцця рашучых мер супроць «няскромнасці» друку.

Пасля гэтага па прапанове французскага прадстаўніка Карбэна заява тав. Майскага была перадана для абмеркавання ў падкамісію пры старшыні.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 26 сакавіка. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Іспаніі, учора авіацыя мяцежнікаў зрабіла рад налётаў на пазіцыі рэспубліканцаў і бамбардыравала іх. Бамбардыроўка не прычыніла, аднак, шкоды. Зенітныя гарматы рэспубліканцаў збілі 4 бамбардыроўшчыкі і 2 знішчальнікі мяцежнікаў.

У другой палове дня на ўчастку Ранадлес (на гвадалахарскім фронце) мяцежнікі пасля інтэнсіўнай артылерыйскай і ружэйнай стральбы атакавалі акопы рэспубліканцаў. Аднак, ужо ў 16 гадзін па мясцоваму часу рэспубліканцы перайшлі ў контратаку. Мяцежнікі былі вымушаны адступіць і пакінулі рад пазіцый, якія неадкладна былі заняты рэспубліканцамі.

На захад ад арагонскай дарогі на ўчастку Каса дэ Сангаланцо рэспубліканцы рассеялі атрады мяцежнікаў. Перадавыя часці ўрадавай арміі накіраваліся ў бок Эспіноса дэ Энарэс за 20 км. ад арагонскай дарогі па выходных пазіцый наступлення праціўніка.

На паўднёвым фронце рэспубліканскія войскі, прадпрыняўшы моцную атаку ў раёне Пасабланка (горад на поўнач ад Кардовы) прасунуліся на 10 кіламетраў у напрамку Вільярта. Рэспубліканцы занялі вельмі важныя пазіцыі, якія знаходзіліся ўжо даўно ў руках мяцежнікаў.

***

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі). 25 сакавіка. (БЕЛТА). На адным з мадрыдскіх фронтаў пад смерцю храбрых італьянскі комуніст Карыёні, які біўся на баку рэспублікі ў радах батальёна імя Гарыбальдзі. Карыёні быў адным з арганізатараў італьянскай компартыі. У апошнія гады знаходзіўся ў эміграцыі ва Францыі.



Самая паўночная папярная станцыя ў свеце, пабудавана совецкімі папярнікамі на востраве Рудольфа — самым паўночным востраве совецкага сектара Арктыкі (паміж 87° 41' і 81° 50' паўночнай шыраты) на адлегласці каля 4.000 кіламетраў ад Масквы. Лёдакол «Русанаў» даставіў да берагоў вострава будаўнічыя матэрыялы і неабходнае абсталяванне. Цяпер тут вырас цэлы гарадок — утульныя кватэры, у якіх жывуць 20 зімоўшчыкаў, электрастанцыя, радыёстанцыя, гараж і нават скотны двор. Папярная станцыя вострава — дасканала абсталяваны і добра забяспечаны навуковы пункт, работнікі якога вядуць шырокія навуковыя геафізічныя назіранні. НА ЗДЫМКУ: выгрузка з лёдакола «Русанаў» будаўнічых матэрыялаў і абсталявання для папярнай станцыі на востраве Рудольфа. (СФ).

ПРАВАКАЦЫЙНЫЯ ПАВОДЗІНЫ ІНТЭРВЕНТАЎ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 24 сакавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе: «Сёння дыпламатычных гутарак, якія вёў 24 сакавіка міністр замежных спраў Дальбос, дзве мелі асаблівае значэнне—з паслами Англіі і Германіі. Гэтыя гутаркі заканалі становішча, створанае ў рэзультаце адмаўлення італьянскага дэлегата Грандзі абмяркоўваць пытанне аб адкліканні італьянцаў з Іспаніі. Дальбос падкрэсліў сур'ёзнасць стварыўшагася становішча».

«Прысутнасць рэгулярных італьянскіх войск на Піранейскім поўвостраве (у Іспаніі) было,—указвае далей агенцтва,—засведчана радам бясспрэчных дакументаў. Ва Францыі лічаць, што ў інтарэсах міру адкліканне замежных войск і добраахвотнікаў павінна быць вырашана і ажыццёўлена ў найкарацейшы тэрмін. Францыя паказала свой прымірэнчы дух і цярпенне, аднак, паварот падзей у Іспаніі зволен у адзін прыгожы дзень паставіць пад пагрозу свабоду морскіх зносін Францыі з Паўночнай Афрыкай. Ва Францыі думаюць, што цеснае супрацоўніцтва паміж Францыяй і Англіяй астаецца найбольш верным сродкам, каб папярэдзіць новыя ўскладненні і што абодва ўрады павінны былі-б выпрацаваць агульную пазіцыю пры супрацоўніцтве іншых краін, прадстаўленых у камітэце па неўмяшанню. Трэба прыняць усе меры, каб забяспечыць дзейнасць кантролю, каб перашкодзіць высадцы новых іншаземных кантынгентаў.

У гутарцы з германскім паслом Дальбос настойваў на тым, каб прадстаўнік Германіі ў лонданскім камітэце заклікаў італьянскага прадстаўніка да ўмеранасці, паколькі цяперашняя блізасць Рыма і Берліна даюць магчымасць прадпрыняць такі крок».

***

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 24 сакавіка. (БЕЛТА). Адказваючы ў палаце абшчын (парламенце) на пытанне аб адмаўленні Італіі абмяркоўваць пытанне аб адкліканні добраахвотнікаў з Іспаніі, міністр замежных спраў Ідэн заявіў, што ён не можа ў сучасны момант даць што-небудзь да апублікаванага паведамлення падкамісіі міжнароднага камітэта па неўмяшанню ў справы Іспаніі. Становішча, якое стварылася,—заявіў Ідэн, — разглядаецца зараз англійскім урадам.

Згодна вестак агенцтва Рэйтэр, у англійскіх афіцыяльных колах спакойна адносяцца да заявы Італіі ў падкамісіі міжнароднага камітэта (гл. «Звязду» ад 26 сакавіка) і схіляюцца да думкі, што рашэнне, аб якім заявіў італьянскі дэлегат Грандзі, можа быць зменена.

***

РЫМ (сталіца Італіі), 24 сакавіка. (БЕЛТА). Тон італьянскага друку, які каментуе падзеі ў Іспаніі і работу лонданскага камітэта па неўмяшанню сведчыць аб выключным раздражэнні фашысцкага кіраўніцтва.

Нападкі на Англію і Францыю суправаджаюцца пагрозамі па адрасу гэтых краін.

Газета «Трыбуна» згарача прызнае, што разлікі мяцежнікаў на перамогу могуць у даны час грунтавацца толькі на ўмяшанні італьянскіх войск. «Лёс гэтай вайны,—заяўляе газета, — залежыць ад італьянскіх фашысцкіх добраахвотнікаў... Адказ Італіі ясны і дакладны—італьянскія добраахвотнікі астануцца ў Іспаніі, каб пацвердзіць згубнай кааліцыі супроць нацыянальнага руху, і астануцца там да перамогі».

Германскі друк аб паражэнні італьянцаў

БЕРЛІН (сталіца Германіі), 25 сакавіка. (БЕЛТА). За апошнія дні германскі друк спыніў апублікаванне паведамленняў з іспанскага тэатра ваенных дзеянняў.

Толькі сёння газеты ў самай аспярожнай форме даводзяць да ведама чытача аб паражэнні фашысцкіх войск на фронце Гвадалахары.

«Можна канстатаваць, што пачатае на гвадалахарскім фронце наступленне генерала Франко часткова правалілася», — піша блізкая да германскага генеральнага штаба газета «Берлінер берзенцайтунг»,—аднак, «невялікае адступленне праведзена ў поўным парадку».

Газета заканчвае сваю заметку прызнаннем, што «ўзяцце Мадрыда, якое здавалася два тыдні назад вельмі блізкім, цяпер, натуральна, зноў адсоўваецца надоўга».

Трэба адзначыць далей, што пры гэтым германскія газеты наглядна выкрылі самі сябе ў хлусні. Да гэтага часу газеты проста нападалі на «совецкія інтрыгі» і абвяшчалі «большэвіцкай прапагандай» усялякае паведамленне еўрапейскага друку аб наяўнасці італьянскіх «добраахвотнікаў» у Іспаніі, а сёння тыя-ж газеты самі пішуць аб «італьянскіх добраахвотніках» пад Мадрыдам.

Заява каталонскага камісара прапаганды

ПАРЫЖ, 25 сакавіка. (БЕЛТА). Міравітлес — камісар прапаганды каталонскага ўрада, які знаходзіцца ў Парыжы, прыняў прадстаўнікоў друку і зрабіў ім цікавую заяву па поваду германскай і італьянскай інтэрвенцыі ў Іспаніі.

«Германскае і італьянскае ўмяшанне ў справы Іспаніі, — заявіў Міравітлес, — паказала наступнае: па-першае, германская авіяцыя як у тэхнічных, так і ў адносінах асабістага складу, паказала сябе значна ніжэй таго ўзроўню, на які разлічвалі кіраўнікі Германіі і якога апасаліся іншыя краіны; па-другое, не гледзячы на «высокую тэхніку» германскай прапаганды, гітлераўскім кіраўнікам не ўдалося дабіцца ў пытанні аб інтэрвенцыі ў Іспаніі той аднадушнасці ў насельніцтва, якой яны хваліліся. Са страху насельніцтва маўчыць, але пры малейшай магчымасці рух пратэсту дае сябе адчуваць і лёгка можа разрасціся.

Напрашваецца вывад, што і ў маральным і ў тэхнічных адносінах Германія не гатова яшчэ да вайны.

Аналагічны вывад можа быць зроблен і ў адносінах Італіі, бо пасля поўнага правалу наступлення італьянскіх войск на Гвадалахару ілюзія, што Італія — самая моцная дзяржава ў Еўропе, улятучылася».

ПАВЕДАМЛЕННЕ ЦК КОМПАРТЫІ ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 25 сакавіка. (БЕЛТА). Бюро друку ЦК компартыі Францыі апублікавала паведамленне аб пасяджэнні палітбюро компартыі, якое адбылося сёння. У паведамленні гаворыцца, што палітбюро лічыць заяву італьянскага пасла ў Лондане Грандзі пагрозай міру і патрабуе неадкладных энергічных дзеянняў з боку Францыі з тым, каб забяпечыць адкліканне фашысцкіх войск, адпраўленых у Іспанію. Палітбюро патрабуе спынення блакады і адпраўлення вольнага гандлю з законным урадам Іспаніі.

У паведамленні гаворыцца таксама, што палітбюро падзяляе думку, выражаную шматлікімі рабочымі арганізацыямі, якія патрабуюць роспуску фашысцкіх ліг, і выражае здзіўленне, што да гэтага часу ніякіх мер у гэтых адносінах не прадпрынята.

Палітбюро, выказваючы радасць па поваду рэзультатаў, дасягнутых шматлікімі профсаюзамі ў адносінах выроўнівання заработнай платы ў адпаведнасці з павышэннем цэн, лічыць неабходным, каб пасля адпачынку парламенцкай сесіі палата дэпутатаў і сенат неадкладна абмеркавалі пытанні аб устанаўленні персанальных пенсій пастарэлым рабочым і важнейшыя патрабаванні дробных гандляроў. У заключэнне ў паведамленні ўказваецца, што французская компартыя налічвае цяпер 302.976 членаў.

Падрабязнасці фашысцка-трацкісцкай змовы ў Валенсіі

ВАЛЕНСІЯ, 25 сакавіка. (Інф. «Праўды»). Сёння сталі вядомы падрабязнасці нядаўна выкрытай у Валенсіі фашысцкай змовы. Падпольная фашысцкая арганізацыя ставіла сабе задачай у выпадку пагоршання ваеннага становішча распублікаццаў захапіць уладу ў горадзе. Імі быў дакладна распрацаван план разні рабочых. Фашысты павінны былі захапіць, перш за ўсё, радыё, адкуль яны павінны былі ад імя нібы камітэта наротнага фронта заклікаць рабочых збірацца ў памяшканнях профарганізацый з тым каб заперці іх там і разграміць.

Фашысцкая падпольная банда займалася таксама шпіянажам і арганізацыяй тэрарыстычных груп. Фашысты набылі 20 тайных радыёстанцый, з якіх 15 было адпраўлена ў Мадрыд і 5 пакінута ў Валенсіі.

У апублікаваным сёння міністэрствам унутраных спраў спісу арыштаваных кіраўнікоў фашысцкай змовы фігуруе нейкі Эдуардо Гарэ, кіраўнік трацкісцкай моладзі, які займаўся зборам сродкаў для фашысцкай арганізацыі і забеспячэннем хаваючыхся фашыстаў дакументамі.

Трацкісты аказаліся злоўленымі з паліччым. Яны выкрыты ў Іспаніі, як удзельнікі фашысцкай шпіёнска-дыверсійнай банды.

НОВЫЯ КНІГІ

КНІГІ АБ ПЛЕНУМЕ ЦК ВКП(б)

У выданні Партыйнага выдавецтва ЦК ВКП(б) вышла з друку брашура **«О решениях Пленума ЦК ВКП(б)»**. У яе ўключаны інфармацыйнае паведамленне аб чарговым Пленуме ЦК ВКП(б), рэзалюцыя Пленума ЦК ВКП(б) па дакладу тав. Жданава, прынятая 27 лютага 1937 г. аб падрыхтоўцы партыйных арганізацый да выбараў у Вярхоўны Совет СССР па новай выбарчай сістэме і адпаведнай перабудове партыйна-палітычнай работы і два перадавыя артыкулы «Праўды»: «Под знаком самокритики и связи с массами» («Правда», № 64 (7030) ад 6 сакавіка 1937 г.) і «Не ущемлять прав члена партии» («Правда», № 65 (7031) ад 7 сакавіка 1937 г.). У брашуры 32 старонкі, цана 20 кап., тыраж 200 тыс. экз.

Адначасова выйшла з друку ў гэтым-жа выданні брашура з тэзісам даклада тав. **Жданава** на Пленуме ЦК ВКП(б) аб задачах партыйных арганізацый у сувязі з прадстаячымі выбарамі Вярхоўнага Совета СССР на аснове новай Канстытуцыі.

***

Асобнай брашурай паступіла ўчора ў продаж пісьмо ЦК ВКП(б) да ўсіх арганізацый ВКП(б) **«Об организации выборов парторганов»**. У брашуры 8 старонак, цана 5 кап., тыраж 500 тыс. экз.

Ф. КАНСТАНЦІНАЎ.

КІНО

„ДЭПУТАТ БАЛТЫКІ"

«Дэпутат Балтыкі» — новы ўкавы мастацкі фільм вытворчасці кіностудыі «Ленфільм» — дэманструецца зараз на кіноэкранах Менска. З першых-жа дзён гэты хвалюючы фільм карыстаецца заслужаным поспехам.

Перад глядачом паўстае малюнак першых дзён Кастрычніцкай рэволюцыі. Трывожна на вуліцах Петраграда, па начах раздаюцца стрэлы, здань голаду навісае над рэволюцыйным горадам... У пішыні свайго халоднага габінета сярод кніг і рукапісаў доктар прыродазнаўчых навук славуты вучоны-батанік, 75-гадовы Палежаеў заканчвае працу, якой ён прысвяціў сем год.

У рэволюцыі прафесар Палежаеў убачыў ажыццяўленне сваіх мар. У большэвіцкіх газетах ён змяшчае артыкул, у якім вітае рэволюцыю. Гэта выклікае нянавісць да яго і цкаванне з боку рэакцыйнай часткі вучоных і нават вучняў прафесара. Ад яго адварачваюцца калегі па рабоце. Агітуемыя меншавікамі, студэнты адмаўляюцца здаваць залікі. Блізкі памочнік і вучань дацэнт Бараб'ёў і той пакідае прафесара. Трагедыя поўнай адзіноты пагражае яму.

Але прафесар не забыт. Не гледзячы на свае 75 год, ён поўны энергіі і надзей. Рэволюцыйныя рабочыя і матросы — не такія ўжо невукі, як іх маляваў вораг. Яны беражліва адносяцца да культурна-гістарычных каштоўнасцей, яны цікавяцца навукай. Балтыйцы запрашаюць прафесара чытаць лекцыі па батаніцы, і ён бачыць перад сабой людзей, за якімі — будучыня. Уладзімір Ільіч Ленін асабіста па тэлефону цікавіцца работай і ўмовамі жыцця прафесара. Прафесар акружан клопатамі і ўвагай большэвікоў, кіруючых сацыялістычнай рэволюцыяй. Не, прафесар не адзінокі! У рэволюцыі навука знайшла свайго саюзніка, знайшла вызваленне ад прынёты царквы, ад мракабесся, ад сярэдневяковага праследвання—тое, чаго чакаў і за што змагаўся ўсё жыццё прафесар Палежаеў. Балтыйцы выбіраюць прафесара дэпутатам Петраградскага совета і на пасяджэнні совета ўсхвалявана і ярка прафесар вітае чырвонагвардзейскія атрады, адыходзячыя на фронт.

— Я застаюся тут з маім народам, з маім урадам, з маім хай зараз і неапенленым універсітэтам, бо свяшчэннага права ўдзелу ў рэволюцыі я не ўступлю ні за якія падачкі.

З новай энергіяй, адчуваючы сябе маладым, акрылены рэволюцыяй, прафесар бярэцца за навуковую работу.

У фільме вобраз прафесара падан такім рэальным, простым і чалавечым, што ён адразу прыкоўвае да сябе сімпатыі глядача. Праз яго вобраз, праз лёс аднаго чалавека паказаны ўзаемаадносіны рэволюцыі з навукай. Гэта — зусім новая тэма на кіноэкране, і яна ўдала распрацавана творчым калектывам, стварыўшым фільм—сцэнарыстамі Дэль, Зархі, Рахманавым і Хейфіцам і пастаноўшчыкамі Зархі і Хейфіцам.

Адчуваецца таксама рэзультат прадумванай ігры артыстаў. Блізка і жыва ўспрымаюцца вобразы жонкі прафесара, якая перажывае з ім горач і радасць, большэвіка Бачарова — падпольшчыка, былога студэнта, вучня і друга прафесара, матроса, які звязаў прафесара з балтыйцамі. Сапраўдную пагарду выклікае дацэнт Бараб'ёў, для якога навука — толькі сродак стварэння асабістай кар'еры. Бараб'ёў здраджвае свайму настаўніку. І як знішчальна, моцна гучаць словы прафесара пры сустрэчы з Бараб'ёвым:

— Пятнаццаць год я вучыў, вёў да не лічы дробнага і нікчэмнага чалавека. Вы прышлі мне прадракаць смерць пад плотам, але ў мяне яшчэ хопіць сілы выкінуць вас на лесніцу.

З высокім майстэрствам зроблены многія эпізоды фільма. Гутарка прафесара Палежаева з В. І. Леніным, яго прамова на пасяджэнні Петраградскага совета, адыход на фронт чырвонагвардзейскіх атрадаў — лепшыя месцы фільма, поўныя шчырай цеплыні і хвалявання. У цэлым фільм пакідае глыбокае ўражанне.

«Дэпутат Балтыкі» з'яўляецца адным з лепшых фільмаў, выпушчаных за апошні год нашай совецкай кінематаграфіяй.

Т. ХАДКЕВІЧ.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

29 САКАВІКА ў 7 гадзін вечара, у фізічнай аўдыторыі БДУ адбудзецца

ПАСЯДЖЭННЕ

АДДЗЯЛЕННЯ ПРЫРОДАЗНАЎЧЫХ І МАТЭМАТЫЧНЫХ НАВУК АКАДЭМІІ НАВУК БССР

сумесна з фізіка-матэматычным факультэтам БДУ, прысвечанае 25-ГОДДЗЮ З ДНЯ СМЕРЦІ П. Н. ЛЕБЕДЗЕВА.

Парадак дня:
1. Уступнае слова — акад. БУРСТЫН Ц. Л.
2. Жыццё і навуковая дзейнасць П. Н. Лебедзева — праф. СНЯТКОЎ Е. В.
3. Фізічныя асновы тэорыі даўлення святла— дацэнт ФЕДАРАЎ Ф.

Запрашаюцца навуковыя работнікі і студэнты.

Уваход вольны.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1) АПОШНІЯ Абанемент № 67.

Памяшк. Дзярж. Яўрэйск. тэатра — БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА Абан. № 3—КАРМЭН

Гукавы кінатэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» ДЭПУТАТ БАЛТЫКІ

Гукавы кінатэатр «Пролетарый» АПОШНЯЯ НОЧ

Гукавы кінатэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» ШУКАЛЬНІК ШЧАСЦЯ

Гукавы кінатэатр «Спартак» АПОШНІ МАСКАРАД

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ КІНОТЭАТР — Сёння і штодзённа

ДВА ФІЛЬМЫ

РВАНЫЯ БАШМАКІ 1, 2 і 3 сеансы | СЯМЁРА СМЕЛЫХ 4, 5 і 6 сеансы.

У фойе іграе ДЖАЗ-АРКЕСТР пад кіраўніцтвам Я. Гараліка. Пачатак сеансаў з 11 г. раніцы.

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 29 САКАВІКА:

8-30 — «Апошнія паведамленні». 17-00 — перадачы для школьнікаў. 18-30 — партвучоба. 19-35 — урыўкі з оперы «Афрыканка». 20-15 — тэматычны канцэрт. 21-00 — літаратурная перадача. 22-00 — эстрада і танцы. 23-00—«Апошнія паведамленні». 23-15 — перадача на польскай мове.

ЗАПОМНІЦЕ,

ШТО ШЭРСЦЬ-ЛІНЬКА ПРАДСТАЎЛЯЕ САБОЙ НЕ АДКІД, А КАШТОЎНУЮ СЫРАВІНУ ДЛЯ ШЭРСЦЕАПРАЦОЎЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ.

ЗБІРАЙЦЕ ШЭРСЦЬ-ЛІНЬКУ!

ДАДЗІМ СОТНІ ТОН ДАДАТКОВАЙ СЫРАВІНЫ ДЛЯ ЛЁГКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ.



Выпадаючая з скуры жывёлы (каня, каровы, вала) вясной у перыяд пініння шэрсць вядома пад назвай ШЭРСЦЬ-ЛІНЬКА.

Арганізуйце збор ШЭРСЦІ-ЛІНЬКІ шляхам чоскі жывёлы са скрабніцамі і шчоткамі.

У перыяд пініння жывёлы (30—40 дзён) можна сабраць да 500 грамаў шэрсці.

Не дапускайце ні аднаго грама страты ШЭРСЦІ-ЛІНЬКІ.

ЗДАВАЙЦЕ САБРАНУЮ ШЭРСЦЬ-ЛІНЬКУ НА ЗАГОТПУНКТЫ СЕЛЬПО, СПАЖЫЎКООПЕРАЦЫІ ПА УСТАНОЎЛЕНЫХ ЦЭНАХ ЗА 1 КІЛАГРАМ.

НАЗВА ШЭРСЦІ-ЛІНЬКІ	Загатоўчая цана за 1 кгр.	Сума, выплачваемая гаспадаркамі скотніцам і даяркам за 1 кгр.
КАРОЎЯ		
БЕЛАЯ	4 р. 80 кап.	2 р. 40 кап.
ЧОРНАЯ	4 р. 20 кап.	2 р. 10 кап.
ЧЫРВОНАЯ	4 р. 20 кап.	2 р. 10 кап.
іш. КОЛЕРУ	3 р. 60 кап.	1 р. 80 кап.

НАЗВА ШЭРСЦІ-ЛІНЬКІ	Загатоўчая цана за 1 кгр.	Сума, выплачваемая гаспадаркамі коньмі за 1 кгр.
КОНСКАЯ		
БЕЛАЯ	3 р. 80 кап.	1 р. 90 кап.
ЧОРНАЯ	3 р. 40 кап.	1 р. 70 кап.
ЧЫРВОНАЯ	3 р. 40 кап.	1 р. 70 кап.
іш. КОЛЕРУ	2 р. 90 кап.	1 р. 45 кап.

ТАВАРЫШЫ КОНЮХІ, СКОТНІЦЫ, ДАЯРКІ ЧЫМ БОЛЬШ ВЫ ЗБЕРЫЦЕ ШЭРСЦІ-ЛІНЬКІ, ТЫМ БОЛЬШ ВЫ ДАДАТКОВА ЗАРОБІЦЕ.

БЕЛКААПСЫРАВІНА ПРЫ БКС.

ДА ЎВАГІ ПРАЎЛЕННЯЎ КАЛГАСАЎ І ЗАГАДЧЫКАЎ РАЙЗА.

БЕЛВЕТСНАБЗБЫТ НАРКАМЗЕМА БССР ДА ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ

ПРАДАЕ КАЛГАСАМ

З СВАІХ МІЖРАЁННЫХ СКЛАДАЎ СТАНДАРТНЫЯ КАЛГАСНЫЯ

ВЕТЭРЫНАРНЫЯ АПТЭЧКІ,

ЯКІЯ СКЛАДАЮЦЦА З МЕДЫКАМЕНТАЎ, ПЕРАВЯЗАЧНЫХ СРОДКАЎ І ХІРУРГІЧНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ, НЕАБХОДНЫХ ДЛЯ АКАЗАННЯ ПЕРШАЙ ВЕТЭРЫНАРНАЙ ДАПАМОГІ ХВОРАЙ ЖЫВЁЛЕ.

СА СКЛАДАЎ ТАКСАМА АДПУСКАЮЦЦА: МЕДЫКАМЕНТЫ, ПЕРАВЯЗАЧНЫЯ СРОДКІ, ХІРУРГІЧНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ ДЛЯ ПАПАЎНЕННЯ Ў КАЛГАСАХ АПТЭЧАК І ЗООТЭХНІЧНАЕ АБСТАЛЯВАННЕ.

СКЛАДЫ ЗНАХОДЗЯЦЦА Ў НАСТУПНЫХ ГАРАДАХ:
ГОМЕЛЬ, ГЕРАСІМОЎСКАЯ, 48.
ВІЦЕБСК, К. ЛІБКНЕХТА, 3.
МЕНСК, КОМСАМОЛЬСКАЯ, 1/13.
ОРША, СОВЕЦКАЯ, 12.
БАБРУЙСК, СЛУЦКАЯ, 8.

ВЕТКІРАЎНІЦТВА НКЗ БССР.

Згубленыя і ўкрадзеныя дакументы лічыць несапраўднымі

БАТВІНІК П. З. — профбілет; СЕРАБРАНСКІ І. Я. — пашпарт № 207883; ПЕЙСАХОВІЧ М. Г. — ваенны білет; ЖІГРОЎСКІ В. В. — пасведчанне асобы; ШЧЭРБІН Х. Я. — профбілет № 620969; ДОЎНАР К. І. — пашпарт і ваенны білет; БІРУЛЯ Я. Я.—пашпарт і профбілет; ЛАХЕЕЎ Т. А. — профбілет; ЛОБАН С. І. — пашпарт № 187000. ваенны білет, профбілет; АГЕЕЎ І. Н.—пашпарт і ваенны білет; ЛІПНЕВІЧ Г. А. — пашпарт; МІНІМ М. М. — пашпарт № 111876; ХАДОСКІН І. С. — пашпарт і ваенны білет; МІЛЬКО Ш. І. — празны білет па чыгунцы; АКУЛІЧ В. М. — профбілет № 000157; ЛАЎРЭНЦЬЕВА А. Я. — пропуск на фабрыку «Кастрычнік»; ШПІЛЕЎСКІ К. І. — пашпарт і ваенны білет.

Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63.

Уп. Галоўлітбела № К—599.

К. К. С.